Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

№ 10
КАСТРЫЧНІК

Набылі кніжку

БССР
імені
ЛЕНІНА

Дарагія таварышы!

Часопісь „Беларуская работніца і сялянка“ ставіць сваёй мэтай дапамагчы партыі ўцягнуць працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, згуртаваць іх для змаганьня з недахопамі ў розных арганізацыях і быту. Але для гэтага мы павінны дамагчыся таго, каб нашу часопісь ведалі, чыталі і пісалі ў яе ўсе работніцы і працоўныя жанчыны Беларусі.

Рэдакцыя паставіла мэтай прасунуць часопісь у гушчу работніц, жонак рабочых, батрачак і працоўных сялянак. Вельмі многа ў нас працоўных жанчын, асабліва на вёсцы, якія ня ведаюць друкаванага слова, ня чытаюць ні газэт ні нашай часопісі.

Мы хочам дамагчыся таго, каб сялянкі праз нашу часопісь пачулі сапраўднае слова аб працы Камуністычнай партыі, аб жыцьці работніц і сялянак. Мы хочам, каб наша часопісь дапамагала сваімі парадамі ў сельскай гаспадарцы, у выхаваньні дзяцей, каб сялянка самай далёкай вёскі праз нашу часопісь атрымала параду ўрача.

У бліжэйшы час мы павінны мець ня менш 20 тысяч падпішчыкаў на нашу часопісь.

Гэта будзе выканана калі вы, жаночы актыў, дапаможаце ў гэтай рабоце. Вы, якія ўжо ўступілі на шлях сьвядомага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, ведаючыя значэньне друку—можаце многае зрабіць для таго, каб прасунуць нашу часопісь у гушчу работніц, жонак рабочых, батрачак і сялянак.

Што-ж вам патрэбна зрабіць?

Падпішыцеся самі, першымі на нашу часопісь.

Дамагайцеся таго, каб кожная актывістка ў вашай вёсцы, у Сельсавеце падпісалася на „Беларускую работніцу і сялянку“. Выклікайце іх падпісацца на часопісь праз насьценгазэты. Растлумачвайце значэньне часопісі ў сваёй вёсцы, арганізуйце падпіску на часопісь, растлумачце працоўным жанчынам, што ў „Беларускай работніцы і сялянцы“ ёсьць карыснага для жанчыны.

Таварышы актывісткі! Арганізуйце ў вашай вёсцы сходы сялянак, на якіх раскажэце пра часопісь і арганізуйце падпіску на яе. Стаўце гэта пытаньне на дэлегацкім сходзе і там вярбуйце падпішчыкаў. Няхай сяляне вашай вёскі, якія падпісаліся на часопісь, выклікаюць падпісацца сваіх суседзяў. Няхай дэлегацкія сходы выклікаюць падпісацца дэлегатак свайго і суседніх раёнаў.

Арганізуйце пры хатах-чытальнях, чырвоных кутках, у хатах грамадчых—гурткі прыхільнікаў часопісі, умовіўшыся аб гэтым з жаночымі арганізатарамі, хатачамі партыйнымі або камсамольскімі ячэйкамі.

Работніцы і жонкі рабочых! Праводзьце падпіску на часопісь у ЖАКТах.

Тав. упаўнаважаныя! Разгарніце сваю працу па распаўсюджваньню часопісі. За летні час ваша праца паслабла.

Дэлегаткі старага і новага складу! Памятайце, што першымі падпішчыкамі на нашу часопісь павінны быць вы. З вас возьмуць прыклад іншыя жанчыны.

Кожная чытачка нашай часопісі лёгка можа завербаваць некалькі падпішчыкаў.

Дарагія таварышы! З вашай дапамогай мы азнаёмім з часопісьсю тых сялянак, якія аб ёй яшчэ ня ведаюць.

Памятайце, што кожны № „Беларускай работніцы і сялянкі“ распаўсюджаны вамі—гэта перамога над цемрай, над забабонамі, гэта дапамога ў высьвятленьні задач Камуністычнай партыі, гэта парада ўрача, агранома і інш.

Рэдакцыя спадзяецца, што вы безадкладна возьмецеся за справу. Чакаем вашых допісаў аб гэтым.

З тав. прывітаньнем Рэдакцыя „Бел. раб. і сялянка“.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45
Тэлефон № 419

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК
ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ
КОМУНІСТ. ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 1 месяц	. . .	15 кап.
„ 3 „	. . .	45 „
„ 6 „	. . .	90 „
На год	. . .	1 р. 80 „

№ 10 (48) || Кастрычнік (октябрь) 1928 г. || № 10 (48)

Шестой Конгресс Коминтерна.

В конце августа закончил свою работу VI международный Конгресс Коминтерна. Лучшие представители революционного пролетариата и трудящихся масс всего мира с энтузиазмом работали почти 2 месяца над вопросами международного революционного движения. На Конгрессе было представлено 58 коммунистических партий от различных стран всего мира. Рядом с представителями Коммунистических партий крупнейших капиталистических стран Европы и Америки были борцы за революцию и коммунизм колониальных, угнетаемых европейскими капиталистами, стран далекой Азии, Африки и Австралии. Чернокожий негр и белый европеец одинаково работали над вопросом—каким путем скорее освободиться от гнета капитализма, как скорее придти к мировой революции.

Шестой Конгресс обстоятельно обсудил уроки четырехлетней борьбы коммунистических партий (от 5-го конгресса прошло 4 г.), наметил пути работы коммунистических партий отдельных стран, еще теснее связав революционную борьбу в колониальных странах с борьбой западно-европейского пролетариата.

Конгресс принял программу Коммунистического Интернационала и этим самым дал трудящимся всего мира знамя борьбы за коммунизм.

Конгресс заслушал доклад т. Бухарина о международном положении. Из доклада выяснилось, что, несмотря на укрепление капиталистического хозяйства главнейших капиталистических стран, кризис капитализма усиливается. Противоречия и борьба между капиталистами отдельных государств обостряются. Борьба между капиталистами Англии и Америки, Германии и Франции, Америки и Японии за рынки сбыта, за прибыль. Мирным путем им не разрешить этой борьбы, вот почему война неизбежна, вот почему лихорадочно растет вооружение капиталистических государств, вот почему, прикрываясь разговорами о мире, они так готовятся к войне. Капиталисты готовятся к нападению на СССР, чтобы превратить первое в мире рабочее государство в свою колонию. Вот почему трудящиеся массы не должны никогда забывать об угрозе войны.

Шестой Конгресс всесторонне обсудил вопрос о том, как коммунистические партии в своих странах должны вести пролетариат на борьбу с угрозой войны.

Революционный пролетариат должен живо следить за всеми махинациями капиталистов, разоблачать каждый их шаг подготовки к войне.

Коммунистические партии должны подготовить пролетариат и все трудящиеся массы капиталистических стран к тому, чтобы на случай войны вооруженные трудящиеся массы обратили штыки против капиталистов своей страны.

Большое значение имеет борьба коммунистических партий с социал-демократией—этим главным врагом коммунизма. Социал-демократия, так же как и буржуазия, разговорами о мире прикрывает подготовку к войне. При помощи этих разговоров им еще удается вести за собой часть пролетариата капиталистических стран и усыплять их бдительность. Поэтому разоблачение социал-демократических вождей—предателей рабочего класса и завоевание рабочих и широких трудящихся масс на сторону Коминтерна—основная задача коммунистических партий.

Надо усилить работу среди молодежи, втянуть ее в революционную борьбу.

Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

Конгресс дал практические указания как это сделать.

Много времени и внимания Конгресс уделил вопросу революционной борьбы трудящихся масс в колониальных странах Азии, Австралии, Африки и Америки. За последние годы быстро растет революционное движение в этих странах. Примеры этому могучая Китайская революция, революционное движение в Индии и других странах.



Пионер—негр. Сын участника конгресса Коминтерна.

Революционная борьба угнетаемых европейскими капиталистами народов востока подрывает основы империализма. Все коммунистические партии должны еще больше поддерживать и активно помогать революционной борьбе в колониях.

В продолжение последних лет Коминтерн вел упорную борьбу с различными отклонениями от правильной большевистской линии в отдельных секциях Коммунистического Интернационала.

Конгресс дал директиву всем коммунистическим партиям и в дальнейшем вести энергичную борьбу со всякими отклонениями от правильной большевистской линии внутри партий.

Конгресс заслушал доклад о положении СССР, он одобрил политику ВКП(б), отметив большие успехи трудящихся масс СССР в строительстве социализма. Дальнейшая индустриализация страны, под'ем сельского хозяйства, его коллективизация, наступление на кулака, укрепление союза рабочего класса с крестьянством, укрепление обороноспособности СССР—все это было одобрено Конгрессом. Представители всех коммунистических партий, в своих выступлениях, обещали, не покладая рук, работать, над подготовкой пролетариата всех стран для борьбы за защиту СССР—социалистического отечества трудящихся всего мира—от капиталистов.

Решения Конгресса Коминтерна должны стать известными каждой трудящейся женщине. Нужно эти решения не только изучать, но и помогать Коммунистической Партии проводить их в жизнь в повседневной работе.

Сербент.

---

3 ноября Женотделом Минского Окружкома и редакцией „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ созывается в Минске первая городская конференция читательниц „Беларускай Работніцы і Сялянкі“.

Задача конференции—заострить внимание наших читательниц на очередные задачи партии в социалистическом строительстве, всколыхнуть их ряды для большего участия в самокритике. Задача конференции—помочь большему втягиванию женщин в работу печати. Конференция читательниц должна дать толчок большему участию женщин г. Минска в работе нашего журнала.

Конференция должна сказать свое мнение о „Белорусской Работнице и Селянке“, что в нем хорошего и плохого, как он читается работницами и женами рабочих, помогает ли „Белорусская Работница и Селянка“ работнице и жене рабочего в их работе на производстве, в общественной жизни, в переустройстве быта. Конференция должна сказать чего ждут трудящиеся женщины от журнала.

Редакция призывает читательниц „Беларускай Работницы и Сялянки“ со всей серьезностью подготовиться к конференции.

В период до конференции наши читательницы должны всесторонне обсудить все хорошие и плохие стороны нашего журнала. Передайте свое мнение о журнале делегаткам, которых вы изберете на конференции. Отзывы читательниц о журнале, высказанные на конференции, помогут редакции поставить журнал так, чтобы он больше отражал запросы трудящихся женщин.

Женорганизаторы и уполномоченные, ждем от вас серьезной подготовки к конференции.

Редакция.

Нашы задачы ў хлебазагатоўках.

Артыкул Наркамандлю т. Адамайціса.

Чаму не хапае хлеба?

Недахоп хлеба, які быў вясною гэтага году, мы зараз адчуваем ня так востра, але і зараз маюцца труднасьці ў поўным здавальненьні насельніцтва хлебам.

Чым-жа гэтыя цяжкасьці выклікаюцца?

Вядома, што БССР сваім хлебам ня можа пракарміцца. У Беларусь, у працягу апошніх гадоў, завозіцца з іншых раёнаў Савецкага Саюзу да 19 млн. пудоў хлеба ў год. Такім чынам, здавальненьне хлебам насельніцтва Беларусі залежыць ад становішча хлебнага рынку ва ўсім Савецкім Саюзе.

Аб галоўных прычынах, выклікаючых недахоп хлеба пісалася ў „Беларускай работніцы і сялянцы“ за жнівень месяц. Зараз мы коратка спынімся на становішчы хлебазагатовак у сучасны момант.

Вясной гэтага году на Украіне і паўночным Каўказе ад замаразкаў згінула больш 5-ці мільёнаў дзесяцін пасеву. Гэта выклікала ня толькі скарачэньне там загатовак, але Ўрад павінен быў накіраваць туды для перасеву 30 мільёнаў пудоў хлеба, які вызначан быў для здавальненьня гарадоў.

Сёлета ўраджай хлеба па ўсяму Саюзу ў некаторай частцы нават перавышае мінулагодні, але-ж, па прычыне кепскага надвор'я, збор ураджаю спазьніўся.

Зараз галоўная маса ўраджаю прыходзіцца на Сібір, Урал і Паволжа, адкуль прывезьці да нас хлеб значна далей, як з Украіны і Паўночнага Каўказу. Трэба мець на ўвазе, што ў Сібіры і Кіргізіі слабая чыгуначная сетка, і завоз хлеба адтуль ідзе марудна. Атрымоўваць хлеб па прыкладам мінулага з Украіны і Паўночнага Каўказу, у гэтым годзе немагчыма, па прычыне нізкай ураджайнасьці гэтых раёнаў.

Сібірскі хлеб звычайна даходзіць да нас пазьней (лістапад, сьнежань м-ц). Такім чынам, поўнага здавальненьня попыту на хлеб мы чакаем прыблізна ў лістападзе месяцы.

Вось чаму нам трэба асабліва зьвярнуць увагу на мясцовыя хлебазагатоўкі.

Куды прызначаны загатоўлены намі хлеб?

Па Беларусі трэба загатовіць сёлета 4 мільёны пудоў хлеба, у тым ліку 2 мільёны пудоў будзе сабрана ад памольнага збору па млынох. **Хлеб ад мясцовых загатовак і ад памольнага збору пераважна прызначан для здавальненьня сельскай і местачковай беднаты і рабочых тых прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў гэтых мясцовасьцях. Усе грамадзкія арганізацыі павінны дапамагчы ў тым, каб загатоўка і ўзіманьне памольнага збору былі поўнасьцю выкананы.**

Як-жа ў нас на Беларусі разгортваюцца хлебазагатоўкі.

У жніўні і верасьні гэтага году загатоўлена хлеба значна больш, чым за гэты-ж час у мінулым годзе, аднак тэмп загатовак ня можна яшчэ прызнаць здавальняючым. У некаторых раёнах, як, напрыклад: Слуцак (Бабруйскай акр.), Брагіна, Хойнікі (Гомельскай акр.) і ў шэрагу іншых, хлебазагатоўкі разгарнуліся і ідуць ня кепска, але побач у большасьці раёнаў тэмп загатовак зусім невыстарчальны. **У шэрагу выпадкаў загатавіцельныя арганізацыі яшчэ не дамагліся таго, каб маса хлеба папала ў рукі нашых органаў, а ня прыватніку.**

Саўнарком і Наркамгандлю далі рад дырэктыў мясцовым органам, аб пасіленьні загатовак, якія павінны дамагчыся большай працаздольнасьці і ініцыятывы каапэрацыйных арганізацый.

Наша партыя адмяніла надзвычайныя меры ў загатоўцы хлеба, але нам трэба растлумачыць сялянству тое, што, прадаючы хлеб каапэрацыі, яны дапамагаюць Савецкай Уладзе і беднаце.

Урадам прынята рашэньне аб стварэньні запасна-хлебнага фонду ў сельскіх мясцовасьцях, у разьмеры 1 мільёну пудоў. Разам з гэтым, **за лік памольнага збору будуць арганізаваны мясцовыя фонды для забесьпячэньня хлебам сельскай беднаты.**

Прамысловыя тавары накіроўваюцца, галоўным чынам, у хлебныя раёны. У працягу верасьня і пачатку кастрычніка **каапэрацыяй накіроўваецца ў нашы хлебныя раёны больш як на 1 мільён рублёў розных прамтавараў.**

Кожная сьвядомая сялянка, асабліва наш актыў, абраны ў розныя выбарчыя арганізацыі, дэлегаткі—павінны ўсё гэта растлумачыць насельніцтву і дапамагчы каапэрацыі і Ўраду ў хлебазагатавіцельнай рабоце.

Зьверху: т. Хацкевіч—сакратар ЦВК і т. Крэмэр—загадчыца Жанадзелу ЦК КП(б) гутараць з сялянкамі—сябрамі ЦВК.

Зьнізу: Чарвякоў—старшыня ЦВК разглядае кніжку з жанчынай—удзельніцай сэсіі.

Слова работніцы і сялянкі на III сэсіі ЦВК БССР.

З фабрык і вёсак, часова адарваўшыся ад працы, зьехаліся работніцы і сялянкі ў Менск для ўдзелу ў 3-й сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту. Яны прывезьлі думкі рабочых, думкі сялян для таго, каб перадаць іх сэсіі—прыняць удзел у абмеркаваньні важнейшых пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва і культурнага разьвіцьця Беларусі.

Аб чым гаварылі работніцы і сялянкі—удзельнікі сэсіі?

— Электрычнасьць—вось тая магутная сіла, якая перабудуе як усю нашу гаспадарку, так і вёску,—кажа т. Пузанкова па дакладу аб ходзе работы па будаўніцтву Асінаўскай электрастанцыі. Ужо цяпер кожны аграном, зямельны работнік, кожны селянін павінен рыхтавацца да электрыфікацыі беларускіх палёў.

Работніца і сялянка клапоцяцца і аб тым, каб законы нашы былі жыцьцёвымі. Вось што кажа ў сваёй прамове, па пытаньню зацьвярджэньня Крымінальнага Кодэксу, т. Грозная:

— Нашы законы падыходзяць да кожнага паасобку; яны не караюць, а перавыхоўваюць. Але ў нас ёсьць растратчыкі, якія сваімі злачынствамі сьвядома хочуць шкодзіць усяму Савецкаму будаўніцтву. Да гэтых шкоднікаў патрэбна ўжываць больш суровую кару.

Зазначаліся і слабыя бакі, якія маюцца ў нашай працы.

У нас ёсьць сіраты, удовы і наогул бедната, а нашы камітэты ўзаемадапамогі не наладзілі яшчэ сваю працу так, каб дапамагаць ім. Трэба камітэтам паклапаціцца аб сродках, — кажа т. Анішчанка.

А т. Юшкевіч падкрэсьлівае няўважлівыя адносіны Саветаў да ўцягненьня жанчын у іх працу.

— Ня зьнішчана яшчэ думка аб жанчыне, як няздольнай да грамадзкай працы. Сельсаветы не даюць даручэньняў жанчынам—сябрам Саветаў. Жанчына можа працаваць. У час правядзеньня самаабкладаньня ў нас адна жанчына так выявіла сябе, што нават сяляне казалі: „Жанчына на гаспадарчай справе—каштоўны працаўнік".

Нашы сябры ЦВК зноў разьехаліся па фабрыкам і вёскам. Яны разам з усімі працоўнымі будуць там на мясцох дапамагаць праводзіць у жыцьцё тыя каштоўныя пастановы, якія прыняла 3-я сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

Рабселькоркі! Пішэце аб тым, што зрабілі вашы сябры Саветаў для таго, каб палепшыць работу школы, бальніцы, становішча дарог і быту працоўнай жанчыны.

Грамадчыца! Надыходзяць перавыбары Саветаў. Рыхтуйся зрабіць справаздачу выбірацелям аб тваёй працы. Далажы аб рабоце Савету, аб умовах тваёй работы і перашкодах, якія затрымлівалі больш пасьпяховую працу.

Загадзя падумай і абмяркуй, як зьнішчыць недахопы і перашкоды. Падрыхтуй да перавыбарчых сходаў свае прапановы ў наказ новаабранаму складу Савету. Ад работніц, сялянак загадзя даведайся, якія яны заўважвалі слабыя бакі ў рабоце Савету.

Намець працаздольных людзей, якіх ты будзеш раіць у новы склад Савету.

Шчыльней да партыйнай ячэйкі, дапамагай ёй у арганізацыі ўсіх працоўных жанчын для актыўнага, сьвядомага ўдзелу ў перавыбарах Саветаў.

За культуру, за пісьменнасьць!

З кожнай соткі жанчын на Беларусі—72 няпісьменныя. Над гэтай лічбай павінна задумацца кожная працоўная жанчына, асабліва жанчына вёскі, бо гэта няпісьменнасьць больш за ўсё прыходзіцца на вёску.

Партыя і Савецкая ўлада дамагаецца большага ўцягненьня жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва. Зараз рашуча пастаўлена пытаньне аб вылучэньні жанчын на адказную працу. Але ўсяму гэтаму, у значнай меры, перашкаджае няпісьменнасьць і малапісьменнасьць працоўных жанчын. **Няпісьменнасьць—наш зьлейшы вораг, які перашкаджае нам больш шпарка будаваць сацыялістычную гаспадарку.**

Асабліва марудна ў нас ідзе навучаньне жанчын; нават дэлегаткі ў сваёй большасьці застаюцца няпісьменнымі. Запісваюцца ў лікпункты з пачатку году, а ў сярэдзіне году ў большасьці пакідаюць яго. Самі жанчыны тлумачаць гэта тым, што ў лікпункт далёка хадзіць, дома няма на каго пакінуць дзяцей, а ёсьць яшчэ многа жанчын, якія кажуць: „Я ўжо старая і няпісьменная дажыву свой век“ (так кажуць нават тыя, якім па 27—30 г.).

Зараз, калі партыя і ўлада востра паставілі пытаньне аб змаганьні з няпісьменнасьцю, **работніцы і сялянкі павінны зрабіць барацьбу з няпісьменнасьцю сваёй справай.**

Жаночыя арганізатары, дэлегаткі, грамадчыцы, на дэлегацкіх і агульных сходах работніц і сялянак, на нарадах грамадчыц павінны абгаварыць пытаньне аб арганізацыі лікпунктаў, а таксама дамагчыся таго, каб работніца, жонка рабочага, асабліва сялянка, ня толькі запісалася, але і наведвала лікпункт.

Асабліва трэба будзе ўважліва абгаварыць пытаньне, як прыцягнуць на лікпункты бяднячак, батрачак, сярод якіх больш за ўсё няпісьменных.

На жаночы актыў вёскі, сяброў Сельсавету, Камітэтаў узаемадапамогі, старых дэлегатак і іншых грамадчыц ляжыць абавязак—у першую чаргу зьнішчыць сваю няпісьменнасьць і сваім прыкладам пацягнуць за сабой і другіх. Абавязак кожнай актывісткі — штодзённа растлумачваць няпісьменным жанчынам на прадпрыёмстве, у жыльлёвых каапэратывах, у свай вёсцы аб неабходнасьці наведваць лікпункт.

Справа актывісткі ўзяць на сябе пачын арганізаваць лікпункт у сваёй вёсцы, у жыльлёвай каапэрацыі, у клюбе і чырвоным кутку, а таксама цікавіцца тым, як ён працуе, як наведваюць яго сялянкі, чаму ня ходзяць. Кожны раз прыйсьці на дапамогу жаночаму арганізатару, настаўніку наладзіць работу па зьнішчэньню няпісьменнасьці.

Трэба палепшыць працу ячэек „Прэч няпісьменнасьць“. Такія ячэйкі працоўныя жанчыны павінны арганізаваць у вёсках, жыльлёвай каапэрацыі, уступіць у іх сябрамі, вылучаць у бюро гэтых ячэек найбольш працаздольных жанчын.

Для батрачак, бяднячак, якія ня могуць часта наведваць лікпункты: па ўмовам працы або няма чаго адзець, няма на каго дзяцей пакінуць—для такіх трэба арганізаваць групы па некалькі чалавек; да гэтых груп, альбо да асобных жанчын, трэба прымацаваць комсамольцаў, умовіцца з настаўнікамі і іншымі пісьменнымі для абучэньня.

Часта дарослыя жанчыны ня ходзяць у агульныя лікпункты таму, што ня хочуць вучыцца разам з падлеткамі („Што я пайду з дзяцьмі вучыцца“, кажуць яны). У такіх выпадках трэба абавязкова арганізаваць асобныя лікпункты для жанчын.

Посьпехі ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці мы будзем мець тады, калі ўцягнем ў гэту справу актыў, грамадзкія арганізацыі і самі х няпісьменных.

Патрэбна ўпартая і настойлівая работа на гэтым фронце.

М.



Работніца Шыбалка і дэлегатка Яцэвіч, ліквідавалі няпісьменнасьць; актыўныя грамадзкія працаўніцы.

Сялянка! Ты пераканалася, як кепска быць няпісьменнай, пасылай сваіх дзяцей у школу. Не прымушай дзяцей зараз пасьвіць стада, а пасылай іх у школу сваячасова, бо калі ты пашлеш іх пасьля першага сьнегу, то яны не дагоняць астатніх дзяцей, ім будзе цяжка вучыцца ўсю зіму, і посьпехі будуць слабейшыя.

Грамадчыца і дэлегатка! Клапаціся аб тым, каб школа была забясьпечана апалам. Стаў гэта пытаньне перад сельсаветам. Абгаварэце пытаньне аб школе на дэлегацкім і агульным сходзе жанчын.

(*Окончание*)

IV

— Ах, ты моя бедняжечка маленькая! Ненаглядная, посинела вся. Где ты там болтаешься, баловник?—поднимала Лиза уснувшую на песке Нинку, вечером придя домой. Ах-ах ты паршивец! Вот уже я с тобой разделаюсь. Давно бы домой нес.

— Давай снесу,—рыбкой вынырнул Шурка из опрокинутой огромной бочки.

— Я тебе дам, снесу. Наверное, целый день здесь торчала девчонка.

— И нет. Я на руках ее нянчил,—оправдывался Шурка.

— Ты подержишь-оно и видать. Гуточка, иди моя маленькая. Иди, доченька, домой,—обласкала Лиза Гутьку, дремавшую в уголке, на чьем-то старом коврике. Та, по-старушечьи с кряхтеньем, поднялась и покатилась на кривых ножках за матерью.

— Мама, а я погуляю еще немножко,—крикнул Шурка, залезая опять в бочку.

— Я те погуляю, не набаловался еще за день. Домой, живо. В лавочку пойдешь.

— У, какая,—прогудел недовольно Шурка и поплелся, опустив голову.

— Ох, Лизанька! жалко мне тебя, да ничего не поделаешь. Все жильцы на выселении настаивают, покою нету,—встретила в дверях Настасья.

— Что такое,—дрогнул Лизин голос.—Опять видно скандалил.

— И не говори. Упал на ребятишек,—переполохал, рев подняли.

— Так выселяйте его. Я-то чем виновата,—Лиза умоляюще смотрела на Настасью.

— Друг ты мой сердечный? Куда его выселишь? Все равно к семейству ходить будет. Ведь пословица есть справедливая: где муж, там и жена.

К сердцу Лизиному жалости клубок подкатился. — Неужели пропадать с таких лет. Ведь им всего-то по тридцати лет. А ребятишки чем виноваты? Нет, нет, не может быть! Федор исправится. Ведь раньше же, еще недавно, он совсем другим был.

В комнате обдало затхлостью, бедность выпирала из углов. Сунула Шурке мелочь на картошку, а сама, положив уснувшего ребенка, наскоро прибрала комнату.

V

— Не, кричи, а то папка драться будет. Вон он какой страшный. У-у, бука, с'ест, ам-ам.

— Нет не ам. Папа мой.

— Твой, его в исправительный дом посадят, он скандалил вчера, у тетки Моти всю небель сломали.

— Нет, не папа, папа мой,— дрожащий детский голосок прозвенел над самым ухом Федора. Милые, родные звуки. Кто это говорит, его ребенок, его маленькая дочка жалеет отца, заблудшую овцу пожалел маленький слабенький цветочек.

— Доченька, Гуточка! — Маленькая ручка гуляла доверчиво по разбитому, вспухшему лицу.

— Родные, простите меня,— всхлипнул Федор, содрагаясь на кровати.

— Саша, где мать?

— Нету на работе. Спи уж, никуда не ходи,—прогудел Шурка.

Задвигался, завозился, как поломанная машина, заскрипел Федор.

— Гадина — вспомнилось все вчерашнее. — Как низко может упасть человек. Рабочий. У-у, противная змея,—скрипнули зубы. Конец, всему конец. Пойду в завод, на коленях умолять буду, чтобы приняли. Ох,-мехами вздулась широкая грудь. Как посмотреть, трезвому, в глаза жене? Стыд, до чего опустился,— мысленно казнил себя Федор.

В кухне у раковины долго мылся и растирал ушибленные места.

— Ты куда, папка, опять напьешся? Не уходи.

— Сынок, не напьюсь. Я скоро. Не беспокойтесь, не увидите больше папку пьяным—Федор сжал в об'ятиях Шурку.

— Тише ты! Ребро прижал— выскользнул тот, приседая вниз.

— Скорей, смотри вертайся— важничал Шурка.

— Папка, скорей булочки принеси,—звенел Гутькин голосок.

Музыкой отдавались в сердце Федора детские наказы.

Родные звуки, давно к ним не прислушивался, позабыл их. Вот они снова. О, милые.

— Скоро, скоро вернусь.

VI

Вторая неделя черной ночью тянется для Лизы. Как ушел Федор после злополучной ночи, не возвращался. Ребятишки говорят, что хотел скоро притти, но не верится. От стыда, наверное покончил с собой.

Обошла все пивные, где он бывал, никто не видел и не слышал о нем.

— Вдруг убили, вдруг посадили куда аль утонул?—По телу мурашки ползали от таких мыслей. Прислушивалась ко всякому шуму. Нет и нет.

— Ты мама не плачь о папке, без него лучше, никто скандалить не будет, — уговаривал Шурка.

— Глупенький ты немысленок! Без отца-то не очень сладко.

Однажды утром Лиза встала совершенно разбитая. Что делать? Внутри, под самым сердцем, бьется новая жизнь. Куда, зачем? На аборт ни копейки нет, через тройку хлопотать долго. Ребятишки присмирели. В уголке за комодом играли.

— Невмоготу, вижу, тебе, скандалиста все жалеешь,—лисицей в комнату нырнула Мотя.—Ты родная, не имей сердца на меня, ничего у нас с ним не было, все Настя сплела.

— Отстань.—Лизина рука поднялась и плетью шлепнулась обратно на колени.

— Ничего не хочу вспоминать.

— И лучше, давно бы так. Что ты, другого мужика не найдешь, что-ли—заулыбалась Мотя.

— Как у тебя язык то ворочается,—вырвалось у Лизы.—Меня ребятишки обсели, за них душа выболела. А она о мужиках. Да до них ли мне, когда четвертый на носу.—Лиза указала на живот.

— О, матушки,—зыкатились Мотины круглые гляделки.—Давно бы мне сказала, у меня есть бабушка, за трешницу в полчаса все обделает.

Дверь тихонько скрипнула, а потом распахнулась. На пороге в рабочей блузе стоял Федор.

— Вон, вон, змея! Лиза, зачем ее принимаеш?—Огромная рука сгребла Мотю за кофточку и выбросила в корридор. Дверь наглухо закрылась.

— Ты жив, Федя?—Голубые глаза налились слезами, а голова забилась о стол.

— Лизанька, прости, если можешь, прости ненаглядная. Я ушел тогда, чтобы другим вернуться. Я бросил пить, Лиза. Работаю теперь.

— Папа, а меня теперь в пионеры запишешь?—подлетел Шурка.

— Папа, а булочки принес?—колесом подкатилась Гутька.

— Мам, мам,—тянула маленькая Нинка из ящика, куда Шурка ее усадил, чтобы покатать.

— Феденька, так ты опять поступил?—сквозь слезы блеснули звездочки в голубых глазах.

— Да, работаю! Прости, если можешь. Вот тебе аванс я взял

...А меня теперь в пионеры.

пока. Поправимся, Лиза не беспокойся.—Федор положил перед нею на стол деньги.

— Мало ли что бывает! Я не сержусь, приподнялась Лиза и улыбнулась сквозь слезы.

VII

Зацвели незабудки на новых обоях в комнате. Порозовели Лизины щеки, повыпукли из ям. Загордился красным галстуком Шурка. Галченком в лагерях загорел. Не узнать Федора. Вычистился, вымылся. Глаз не спускает с Лизы.

Вместе ждут новый цветочек на свет.

— Мама, а мама. Жоржка-то ко мне сам подлизывается. Играть зовет, хвастал Шурка.

— Не связывайся, опять раздеретесь.

— Уж не дамся в обиду.

— Ну, ну, пионеры не дерутся. Стыдно,—блестели белые зубы Федора от улыбки.

Шурка маком рдел и прятал глазенки.

— Давай играть, а, будешь?—давай в лошадки!—тянула Гутька братишку за рукав.

— Не хочу я с девченками связываться.

— У, какой. И не надо. Я с Нининькой поиграю.

— Вот умница доченька, забавляй сестренку, куколку ужо куплю.

Радовалась Лиза на своих шалунов глядя.—Милята вы мои, а я уж думала погибнуть нам, жизнь хотела смять мою и вашу.

— Кто старое помянет знаешь, что бывает,—виновато улыбнулся Федор.

— Ладно, не вспоминаю я. Не в укор, урок только тебе.

VIII

Прошло два года. Уже давно появился живой цветочек в Лизиной жизни. Год уже смотрят его огромные черные глазенки отцовские. Но не видят они света. Не видят солнышка. Слепой родился ребенок, с большой, не ровной головой идиота. Плачет Лиза, качается кудластая Федорова голова.

— Отчего, почему? Ведь мы оба здоровые!

— Был кто нибудь у вас алкоголик в семье, может сами вы или жена пила во время беременности?—сверлили умные профессорские глаза Федора и Лизу,—у алкоголиков часто родятся такие дети.

Застыл испуг, жалость к маленькому, ни в чем неповинному существу в отцовских глазах после профессорских слов.

— Я, я один виноват. Из-за меня страдает ребенок. Будь оно проклято это пьянство. В рот капли теперь не возьму.

Ныло от боли, от раскаяния сердце Федора, жег стыд, сжималось сердце.

А ребенок—невинная жертва—рос слепым и тупым идиотом.

Лявоніха і Сымоніха

Лявоніха і Сымоніха — гэта дзьве блізкія суседкі, дзьве вясковыя ягадкі. Жывуць яны побач, пасярод вёскі, хата каля хаты. Хаты іхныя старэнькія, маленькія, закураныя і нахіленыя адна да аднэй; нібы зацікаўлена, пільна ўглядаецца адна на адну, пазірае вакно на вакно, дах на дах, комін на комін, адны аднымі любуюцца і налюбавацца ня могуць.

А з вакна хаткі сваёй глядзіць Лявоніха на хатку Сымоніхі, хочацца даведацца, што там дзеецца-робіцца, што Сымоніха на сьняданьне ладзіць, якія блíны пячэ, чым падмазвае іх, які хвартух сёньня надзела, ці вясёла яна і аб чым гутарыць з Сымонам сваім, і аб чым думае яна. Лявоніха супакоіцца ня можа. Страшэнна ведаць хоча аб усіх гэтым. Выцягвае шыю, настарожвае вушы, праз пабітую шыбіну ўцягвае носам паветра— мо' што-колечы слухам ці нюхам пачуе...

А Сымоніха ў сваёй хаце робіць тое самае ад пачатку да канца. Так, як і суседка, хоча ўсё знаць—ведаць, што робіцца ў Лявоніхі, з няменшай зацікаўленасьцю, чым Лявоніха.

Але зацікаўленасьць іхняя таксама ня любіць абібоцтва, а шукае рознастайнасьці, руху. І вось Лявоніха з Сымоніхай ня могуць доўга здавальняцца толькі нямым пазіраньнем праз затуманеныя вакенцы сваіх хатак, і кожная з іх ловіць зрэнкамі кожны рух суседкі. Не прапускаецца найкарацейшая гамонка, чуць прыметны шум і рып дзьвярэй або стук вілачніка. І вось суседкі, як-бы раней згаварыўшыся, спотайка соўваюцца з сваіх хат.

Як-бы рыхтуючыся зарэзаць чалавека альбо крадучыся да свайго заліхвацкага палюбоўніка, Лявоніха на пальчыках падыходзіць да дзьвярэй. Ня чутно, як падымае клямку і як напалавіну высоўвае сваю галаву. І вось з замірaньнем сэрца Лявоніха блісь адным вокам у бок Сымонавай хаты, каб разок хоць глянуць, што там робіцца.

Але, як толькі зірнула, дык, як апараная варам, адскочыла назад і стукнула дзьвярыма. Пры гэтым стукнулі дзьверы і Сымонавай хаты, бо Сымоніха рабіла тое самае, і яны ўгледзелі адна адну ў імгненьне вока, у адных і тых самых позах, з аднымі і тымі самымі выразамі зацікаўленасьці ў вачох. Пры гэтым яны зрабіліся страшэнна падобнымі адна да аднэй, і кожнай здавалася, што яна толькі глянула ў люстэрка.

Троху адсопшыся, яны зноў прыняліся за сваю работу. Урэшце, абедзьве, ня вытрываўшы, вышлі з сваіх хат, нібы надвор'е паглядзець і курэй паклікаць.

— Ціп-ціп-ціп-ціп,—кажа Лявоніха.

— Ціп-ціп-ціп-ціп, —кажа Сымоніха.

І голас у іх адзін і той самы— троха пісклявы, троха з хрыпоткай, троха салодкі і троха горкі, троха лагодны і троха сварлівы.

— А дзе-ж мае куры дзеліся, каб іх каршун,—кажа Лявоніха.

—А дзе-ж мой певень прапаў, каб ён здох,—кажа Сымоніха.

Пры гэтым яны паглядаюць адна на адну няшчырымі, масьлянымі вачыма. Хітрасьць і фальш відаць у кожным іх руху, у кожным павароце. А болей усяго гэта відаць у іх гутарках. Гэта хітрасьць даходзіць да сьмяхоты, да наіўнасьці, да нейкага асобнага выразу шчырасьці, і кожная з іх ведае думкі другой лепей, чымся свае ўласныя.

Страляючы вачыма адна ў адну, Сымоніха з Лявоніхай патроху пачынаюць гутарку, як-бы наладжваючы скрыпкі. Мова іх на першы погляд здаецца самай простай і бязьвіннай, як дзіцячая гутарка, але яна і ня простая і не бязьвінная. Для таго, каб зразумець глыбокі сэнс гэтай мовы, дык тут напэўна патрэбен добры тлумач—інакш чалавек не пачуе праўдзівага смаку.

— Дзень добры, Сымоніха,— кажа Лявоніха.

Гэта значыць: галавой уніз, паскудніца.

— Добры дзень, Лявоніха,—кажа Сымоніха.

Гэта значыць: згінь ты, прападзі, падла старая.

— А даўненька мы ня бачыліся, суседачка.

Гэта значыць: каб цябе, пагаліцу, ужо болей ніхто ніколі не пабачыў.

— А во, іду даведацца, як ты маешся, міленькая.

Гэта значыць: чаму так доўга ліха цябе яшчэ не забрала, шэльма.

Пры гэтым суседкі дробненькімі і пэўнымі крокамі падыходзяць адна да аднэй, не пера-

рываючы сваёй гутаркі дыплёматычнай.

— Эт,—кажа Лявоніха цукровым голасам,— жыву — гадуюся, як горах той пры дарозе, кратаюся як-колечы.

— А што чуваць у цябе, кумачка-любачка?

Гэта значыць: трасца табе ў бок, ліха тваёй матары. Прышла ты, сарока, выведаць, што ў хаце маёй робіцца—скульлё даведаешся, недачаканьне.

— Эт,—кажа Сымоніха мядовым галасочкам,—і дабра ня чуваць і ад ліха ня ціха. Ой, бедная мая галовачка. Ой, жыцьцё маё палынь-травіцаю зарасло.

Прыяцельцы можна троха пажаліцца ды паскардзіцца.

Гэта значыць: каб ты не дажыла, не дачакалася, пакуль я буду табе хваліцца, нячыстая



Хочацца даведацца,

душа, сваім багацьцем.

Працую і жыву. Я не такая крывуля, як ты.

Бабы робяць кіслыя твары, кожная на свой лад. Гэтыя фізыяноміі вельмі розьняцца адна ад аднэй і вельмі падобны. Яны гавораць і мімікай.

Постаць Лявоніхі кажа бяз слоў, але выразна:

— З чым прышла, з тым і пойдзеш скрозь зямлю.

Выгляд Сымоніхі кажа бяз слоў, але досыць зразумела:

— Трэскайся, лопайся, але ты ў мяне шышка невялікая.

І добрыя суседкі далей гавораць:

— Скажы, любанька, Сымон твой перастаў піць? Ён рукамі болей да цябе ня соваецца?—пытаецца Лявоніха і вочы яе робяцца рахманымі і жаласьлівымі.

Гэта значыць: думаеш, гадзіна, ня ведаю, што ён тваю скуру лупіць і ўдзень і ўночы. Але ты, здыхляціна, гэткага мужыка ня варта.

— Ха-ха-ха, золатца маё,—сьмяецца весела Сымоніха,—як толькі знахар даў мне лякарства, дык рукой адняло—другім чалавекам Сымон зрабіўся; цяпер у мяне ня жыцьцё, а проста рай.

Гэта значыць: хоць пукайся, сьцерва, хоць трэскайся на кавалкі, хоць макам рассыпайся, ня буду табе на радасьць жаліцца, што ў мяне бакі, як цапамі пабітыя ад зялезных кулакоў Сымона, каб ты запрапасьцілася разам з ім.

Лявоніха бярэцца рукамі за твар Сымоніхі, углядаецца ей у вочы, ківае галавой дый кажа:

— А праўду кажаш, дальбог, праўду. Ты цяпер куды лепей нават выглядаеш. Ты зрабілася як тая макавачка чырвоненькая. А круглая круглая, аж зайздрасьць бярэ.

Гэта значыць: агіда ты. Прыгажэйшую за цябе ў труну кладуць. Ой, добранька ведаю жыцьцё тваё пякельнае. Ад мяне, галубка, ня ўтоішся. Не на такую напала.

Сымоніха гладзіць Лявоніху і кажа:

— Няма чаго грашыць, неяк кратаемся.

Гэта значыць: халеры ты. Каб ты ўгару глядзела ды сонца ня бачыла. Каб цябе скруціла ў тры пагібелі. Нашто сыплеш мне соль на раны?

— Ніхто ў нашым сяле гэтак дружна ня жыве, як мы з табою—зьдзіўлена і натхнёна кажа Лявоніха.

— Ды як-жа іначай, сэрца маё, даражэнькая,—трапляе ёй у тон Сымоніха.

Гэта ўсё значыць: няпраўда, мана, фальш.

— Хадзі ка мне, зязюлечка, у хату. Пагаворым аб тым ды аб сім,—кажа Лявоніха.

Гэта значыць: каб ты на парозе маім ногі сабе паламала, нячыстая душа. Каб ты галаву скруціла на ганку маім.

— Во, гвалтам цягне ў хату,—кажа Сымоніха,--дзякую, сястрычка, ды йдзем у маю хату.

Гэта значыць: калі ніхто ня ведае, як хто абедае, дык я даведаюся, бо ўлегцы мяне ня возьмеш.

— Заходзь ка мне,—кажа Лявоніха.

— Ды ты йдзі ка мне,—упіраецца Сымоніха.

Лявоніха нагвалт хоча зайсьці да Сымоніхі, а Сымоніха—да Лявоніхі.

Доўга цягне Лявоніха суседку



што дзеецца-робіцца.

да сябе ў хату—тая ўпіраецца і і ня йдзе.

Доўга цягне Сымоніха суседку ў сваю хату—тая ня хоча ды годзе.

Урэшце нацягнутыя струны ня вытрываюць і лопаюцца з такім моцным трэскам, што трэск гэты творыць новую музыку. Суседкі пераходзяць ад няшчырасьці да шчырасьці:

— Як...—кажа Лявоніха,—ты ганьбуеш маёй хатай,—і вочы яе прымаюць свой праўдзівы выгляд—злосны, зьняважлівы.

— Як...—кажа Сымоніха,—ты пагарджаеш маім кутком,—і вачыма пазірае яна на суседку так гнеўна, як-бы яе зьесьці хоча.

Слова за слова—і з іх пасінелых вуснаў разам са сьлінай пачынаюць сыпацца такія адбор-

ныя і ядраныя слоўцы, як пацеркі, як зорачкі, як зялезны боб, як горкі перац. І тут ужо тлумач непатрэбны, бо кожнаму і так добра зразумела.

— Ты—сякая, ты—такая,—крычыць Лявоніха.

— Ты—такая, ты—сякая,—грыміць Сымоніха.

— Шэльма,—лаецца Лявоніха.

— Гадаўка,—дражніцца Сымоніха.

— Шэльма. Шэльма. Шэльма...

— Гадаўка. Гадаўка. Гадаўка...

Адна адну проста заклінае гэтымі брыдкімі словамі. Але болей і слоў ужо не хапае, і яны ад слоў пераходзяць да рук:

— Во!

— На!

І дзьве фігі, як дубовыя сукі, выходзяць на сцэну. Фіга Сымоніхі пападае проста ў нос Лявонісе, а фіга Лявоніхі—акурат у нос Сымонісе. Але не ад фігі пачалася і ня фігамі канчаецца гэта гісторыя. Пачынаецца новая праца звычайнымі кулакамі, потым парканінамі, потым пачынаюць качаць адна адну па зямлі і рваць за доўгія валасы. Ды ёсьць у іх розныя спробы калатні—усіх і не пералічыш адразу.

На крыкі і ляманты зьбягаецца ўся вёска. А Сымон з Лявонам стаяць каля сваіх хат ды толькі сьмяюцца. Вось гэты сьмех памагае разьюшаным бабам, як халодная вада. Пачуўшы сьмех сваіх мужыкоў, яны перарываюць калатню, ускакваюць з зямлі і кожная злосна кідаецца на свайго мужа за тое, што, гад, ня толькі не дапамагае ў гэтай бядзе, каб выйсьці з гонарам, ды яшчэ сьмяецца з свае пакрыўджанай жонкі.

Пасьля гэтага суседкі цэлы дзень, кожная на сваім дварэ, крычыць адна другой такія словы і вытвараюць такія штукі, якія людзі добрыя ня ведаюць і сьвет ня бачыў.

Пасьля гэтага суседкі пару дзён зусім ня цікавяцца адна аднэй—ня прыслухоўваюцца і ў вокны не паглядаюць.

А ў нядзелю йдуць разам на кірмаш, як ні ў чым ня бывала, і дружба іх яшчэ болей павялічваецца.

Пасьля кірмашу пачынаецца ў іх уся гісторыя з самага пачатку, перайначаная на новы лад—дзе дабаўляецца, дзе адбаўляецца—сьвяжуткая, навюсенькая гісторыя, як-бы толькі радзілася яна на сьвет.

Гэтак ідзе тыдзень за тыднем, месяц за месяцам, год за годам, акуратна, як па загаду звышку.

І трэба прызнацца, што Сымоніха з Лявоніхай маюць вялікі спрыт прыдумваць на кожны раз новыя прычыны, за што цалаваццa і за што біцца, робячы гэтым прыемнасьць сабе і людзям.

З. Бядуля.

Выстаўка гуртка кройкі і шыцьця пры Полацкім чыгуначным клюбе. На выстаўцы 1.200 экспанатаў. Гурток існуе 3 гады, аб'яднае 76 жанчын.

Как исправить закон о браке, семье и опеке.

Ни один закон так широко не обсуждался трудящимися массами, как Кодекс о браке, семье и опеке. Только после обсуждения этого закона на собраниях рабочих и крестьян он был принят Центральным Исполнительным Комитетом.

Казалось, что все предусмотрено Кодексом. Ни в одной в мире стране нет таких законов, которые бы так защищали равноправие женщины и интересы детей, как наш Кодекс о браке. Несмотря на это есть целый ряд жалоб, заявлений и замечаний, в особенности от женщин, о том, что Кодекс защищает интересы женщины **недостаточно.**

Есть много случаев, когда женщина, покинутая мужем, остается с малыми детьми и ей приходится переносить много трудностей, потому что средств на воспитание ребенка она от отца не получает. Суд присуждает алименты, но они не взыскиваются: отец часто уклоняется от уплаты алиментов, уезжает в новую местность, распродает имущество и делает много других комбинаций, уклоняясь от уплаты денег на воспитание ребенка.

Вполне понятно, что с развитием социалистического строительства, с улучшением экономического положения нашей страны, когда наше рабочее государство сможет взять всех детей на свое иждивение, таких жалоб и недовольствий не будет. Сейчас это еще пока невозможно. Отсюда обязанность родителей и ближайших родственников, предусмотренных законом (дед, бабушка, брат, сестра) давать средства, необходимые для воспитания своих детей, братьев или внуков.

Рассмотрев имеющиеся жалобы и замечания, приходишь к выводу, что **закон о браке, семье и опеке все же требует некоторых дополнений и изменений.** В этом направлении работа уже ведется. Наркомюст БССР разрабатывает проект этих дополнений и изменений. Этим проектом намечается следующее:

1. Если супруги при разводе не договорились, кто из них и в какой мере дает средства на воспитание детей, учреждения ЗАГС'а не регистрируют такой развод до тех пор, пока суд не разрешит этого спорного вопроса.

2. Лица, с которых присуждены алименты, под угрозой уголовной ответственности, должны извещать об изменении места своего жительства и места работы по найму тех людей, которые должны получать алименты и тех, которые взыскивают их.

3. В случае, если на одном из членов крестьянского двора лежит обязанность уплаты алиментов, выделение из общего двора этого члена семьи может быть только после извещения об этом лица, получающего алименты или опекуна. Этим лицам и опекунам дается право поднять вопрос перед судом об обеспечении выплаты алиментов и наложении ареста на имущество ответчика.

4. В случае смерти обоих родителей, несовершеннолетние дети имеют право на получение средств на свое содержание от отчима или мачехи, если они были на иждивении их еще при жизни одного из родителей.

5. При разрешении вопроса о содержании ребенка, если ответчик является не отделенным членом двора, и его личного имущества нехватает для обеспечения ребенка, суд может вынести постановление о взыскании недостающей суммы алиментов с имущества и прибылей всего двора. Сумма эта, однако, не должна превышать долю, которая бы следовала ему при выделении из двора. Если учреждения или лица, выполняющие постановление суда о взыскании алиментов, обнаружат злостное уклонение от уплаты, об этом ставится в известность суд, который вынес решение, и он может вынести решение о взыскании алиментов с имущества общего двора, членом которого является ответчик.

6. Лицам, которым присуждена уплата алиментов, запрещается продавать принадлежащие им постройки, предприятия без согласия на это лица, получающего алименты, опекуна или попечителя. Продавать или передавать указанное имущество можно только в том случае, если внесено обеспечение, размер его устанавливает суд, по решению которого взыскиваются алименты по просьбе заинтересованного лица.

Указанные изменения в Кодексе о браке, семье и опеке необходимо внести для того, чтобы лучше обеспечить взыскание алиментов.

Существующие законы и циркуляры Наркомюста дают указание о том, что алименты взыскиваются в первую очередь. Учреждение или предприятие, где работает лицо, платящее алименты, должны аккуратно взыскивать деньги с ответчика, с получаемой им заработной платы, и направлять их по принадлежности.

Уголовный Кодекс предусматривает уголовную ответственность лиц, которые уклоняются от уплаты алиментов.

Все же с мест поступают сведения о том, что здесь волокита имеется.

Часто это бывает потому, что трудящаяся женщина, не зная своих прав, не умеет защищать свои интересы.

Трудящаяся женщина должна быть хорошо ознакомлена с правами, которые дает ей Кодекс о браке, семье и опеке, и требовать от Советов и судебных органов защиты этих прав.

Все поправки к Кодексу о браке и семье направлены, главным образом, на самое больное место—взыскание алиментов, о чем больше всего поступают жалобы от трудящихся женщин.

Может быть не все еще предусмотрено, и следует еще кое-что изменить. Трудящаяся женщина, сталкиваясь с этим вопросом на месте, лучше знает недостатки. Поэтому **работницы, крестьянки, жены рабочих на страницах журнала должны высказать свое мнение по этим вопросам. Это поможет законодательным учреждениям внести необходимые поправки в существующий Кодекс о браке, семье и опеке и лучше обеспечить защиту интересов матери и ребенка.**

Бутар.

От редакции. Мы просим наших рабселькорок, работниц, батрачек, крестьянок и жен рабочих высказаться по затронутым в статье т. Бутара вопросам.

ПАДАГУЛІМ ПОСЬПЕХІ Ў ЕЕ

ДЭЛЕГАЦКІ СХОД НА ВЁЦЬ У ПАЛЯПШЭНЬНІ СЕЛЬСКА ПРАЗ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ І ВЕДЫ ПАДВОЇ УР

Зьверху—накідае гной, зьнізу—даглядае парасят.

Бульба і авёс на-дзіва.

Даведаліся Навасёлкаўскія дэлегаткі, што ў запасным фондзе зямля ёсьць.

— Адвядзіце нам дзесяціну зямлі, мы калектывам гарод засеем.

Сельсавет згадзіўся.

Прынясла кожная па кашэліку бульбы. Арганізавалі самі вечар. 5 пуд. аўса прыдбалі за выручаныя ад вечара грошы і столькі-ж Камітэт Узаемадапамогі выдаў. Вось так дэлегацкі сход назьбіраў насеньня.

Жанкі вясковыя на прызьбе сядзяць, а дэлегаткі гуртом свой гарод даглядаюць. Рупна жанкі даглядалі гарод, затое зараз ёсьць чым пахваліцца.

Бульба і авёс урадзілі на-дзіва.

Ураджай дэлегаткі мяркуюць аддаць на карысьць МОПР'у.

Працавітая.

Пухавіцкі раён.



У чырвоным кутку

Многа нянек—дзіця з носам.

Нардомаўскі вучастак зямлі сёлета ўзяліся апрацаваць дэлегаткі. Засеялі ярыну, а рэшта занялі пад гародніну.

Запрацавалі 15 дэлегатак, ня толькі зембінскія, а нават з вакольных вёсак.

— Многа дужа нянек, ня інакш як бяз носу дзіця апыніцца,—пра сябе казалі некаторыя.

Але гэта пароцтва ня збылося. Вынікі стараннай працы відавочны: лёну сабралі 5 коп. і 10 снапоў, а буракі хоць і ў зямлі яшчэ, але, як бачна, будуць удалыя.

Прыбытак ад зямельнага вучастку дэлегаткі думаюць аддаць на культасьветныя патрэбы дэлегацкага сходу.

Здаволеныя ўдалай спробай дэлегаткі мысьляць на будучы год

На сенажаці.

ЎЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

НА ВЁСЦЫ—ЗАСТРЭЛЬШЧЫК
НІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.
ІЗАЦЫЯ І АГРАНАМІЧНЫЯ
АДВОРАЎ УРАДЖАЙ.

Ударны куток калгаснай моладзі імя „Зьвязда".

Гаспадарку зраблю паказальнай.

— Як абралі мяне дэлегаткай, я зразумела, што трэба гаспадарку перабудоўваць на новы лад,—кажа на раённым жаночым сходзе дэлегатка Багун з вёскі Загорнае.

— Я купіла на 2 капейкі турнэпсу, пасеяла, і ўрадзіла звыш 30 пудоў гэтага караньплоду. У мяне ёсьць зараз 2 гнязда завадзкіх курэй, маю 3 завадзкія сьвінкі. Усё гэта набылося ў маёй гаспадарцы за кароткі тэрмін, дзякуючы таму, што я па парадзе агранома працавала.

А дэлегатцы Хадасевіч таксама ёсьць чым пахваліцца.

— Дэлегацкі сход мне ў 50 гадоў нібы вочы адчыніў,—кажа яна нам.

— Я завяла 3 гнязда галагуцкіх курэй, якія важылі па 5 фунтаў тады, калі ім было толькі па 3 м-цы. Прыдбала ангельскай пароды парася, па парадзе агранома добра даглядаю яго. Пад кіраўніцтвам агранома я апрацоўвала і гарод свой. І зараз я бачу, як многае я зразумела толькі цяпер—на старасьці год: капусту вырасьціла такую, што ва ўсім сяле падобнай ня знойдзеш, кармавыя буракі па 10—12 фунтаў кожны, а сталовыя па 3—4 фунты. Ці гэта-ж было ў мяне раней?

— Я хоць і бедная ўдава, але аддам усе сілы на тое, каб зрабіць сваю гаспадарку прыкладнай і паказальнай.

Так казалі дэлегаткі на раённым сходзе.

Р. Выдрэвіч.

Зьверху—засеў парнікоў. Зьнізу—каля сепаратара.

Удалы ячмень.

узяцца за апрацоўку ўсяго зямельнага вучастку нардома, бо сёлета яны апрацоўвалі толькі частку яго.

Я. Бажок.

Зембін, Барысаўскай акр.

Дзе жыта кусток

— Добры вечар! Ці дазволіце з казою?

У хату гуськом вайшлі калядоўнікі. На чале, у кажусе вывярнутым дагары воўнаю, з начэпленаю барадою, на чацьвяронках, тапталася „каза".

— Го-го го каза,
Го-го-го сера
Дзе рогі дзела?
Дзе каза хвастом
Там жыта кустом;
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам;
Дзе каза туп, туп,
Там жыта сем коп.

Так сьпявалі на ўсе лады калядоўнікі, а „каза" адбівала паклоны гаспадару і жонцы, па загаду важака.

Калі ў торбу палез абручык каўбасы і пірог, а „каза", з падачкаю ў руцэ, вывяла сьпявуноў з хаты, Агапа, зграбаючы венікам натрушаны сьнег, перадражніла:

— „Жыта стогам, жыта капою, жыта кустом", э, мае галубяткі, нечага вам рабіць, дык вы галаву марочыце! Улетку, глянеш на постаць, дык заморышы-каласы ледзь даганяюць адзін другога. Тут патрэбна якаясь іншая „каза".

Агапа села на мурку, украдкі зірнула на мужа, прагаварыла:

— Досыць практыкавацца на „казе". Я думаю наведацца на заняткі сельска - гаспадарчага гуртка. Купіш ня купіш, а пакаштаваць ня шкодзіць.

Сідар коса глянуў на жонку, бы з грошы падараваў. Агапа зразумела, што працягваць гэту гутарку няма ніякага сэнсу. Яна накідала ў печ дроў і пачала слаць пасьцель на ноч.

Гэтым у хаце Сідара скончыўся вечар на шчадраца.

***

Ня раз чула Агапа аб тым, што сельская гаспадарка можа быць многа больш прыбытковай, калі ўмела будаваць яе.

— З чаго пачаць перабудову,— думала яна. Сядзіць увечары ў хаце, а самой так і вабіць лекцыю агранома паслухаць. Заманецца Агапа нібы да суседкі, а сама ў хату-чытальню падбежкі; стане ціханька ў куточку ля парога, слухае. Дамоў прыдзе, ня кажа Сідару дзе была, каб сьмешак ня строіў.

Так цягнулася да вясны. А як толькі сьнег споўз з поля і па раўчакам вясёла загаманілі крынічкі, на дэлегацкім сходзе парашылі арганізаваць каляктыўны гарод.

Сельсавет адвёў некалькі загонаў зямлі з запаснага фонду. Жанкі кідаліся бы мурашкі: шукалі насеньня, жэрдак на агарожу, меркавалі што сеяць.

Для загадваньня гародам абралі 3 дэлегаткі; папала і Агапа ў іх лік.

Гэта самаеі калыпнула Сідара за жывое. Спроба пераканаць упартую Агапу ня ўдалася. З крыўдай на непакорную жонку ён зварочваўся да суседзяў:

— Няхай невучам настаўленьне даюць, — казаў ён. — Але маёй Агапай, хвалёнай гаспадыняй, каб зараз нехта камандаваў?! У бабы за плячыма чатыры дзесяткі гадоў і пяты на горб узьбіраецца, а яе цяпер уздумалі вучыць, якія разоркі пад гуркі трэба праграбаць. Гвалту крычаць трэба. Глумата адна. Ці мала баб на сяле, чаму ўсё гэта ня мінае мае жонкі?!

— Ты аб чым гэта, дзядзька Сідар?

— Аб чым, нібы ня ведаеш. Ды ўсё аб тым-жа. Схадней мець самага натурыстага каня, чым упартую жонку. Каня сьцебанеш пугаю, ня слухае—галінаю перацягнеш,мала--лейцамі шмарганеш; з шкуры лужацца, а пабяжыць куды хочаш. А жанок цяперашніх не закелзаеш, не прыстае да іх ні пуга, ні галіна, і слова добрае да іх прыстае, як гарох да сьцяны. Праўду я кажу, Іване?

— Ня бачу я тут праўды ні ў зуб. Чаго ты лаешся на цётку

Агапу, яна-ж ня дзіця, мае сваю галаву на вязах.

— Як блазнота мяркуеш, — з злосьцю гаркнуў Сідар.—Ня хэўра ты мне. Бабскі забаронец, во хто ты.

Сідар пасмактаў трохі люльку, плюнуў пад ногі і пасунуўся ў хату.

*
* *

— Тыя загоны засеем лёнам, а вось тут пад гародніну займем,— растлумачваў аграном, аглядаючы зямлю.

Дзінькалі залезьнякі ў звычных жаночых руках, і на раней закінутым рагу вырасталі роўныя, рыхлыя градкі.

— Мала месца нам адвялі,—разагнуўшы сьпіну, сьцірала з твару пот Аксеня.

— А навошта нам многа ды дурнога. Мы лепш пасеем маленькае, але вырасьцім даражэнькае, — ня спыняючы працу адказала Маланьня.

Гуртом выходзілі з гароду. На разьвітаньне Агапа наказвала:— ты, Кацярына, тут, пасуседзку, наглядай за гародам. Паліваць па чарзе будзем. Вызначым, калі каму на працу.

— А я практыку і парады аграномa пасьпела пераняць. Што будзе то будзе, а сёлета я па аграномаўску свой гарод засяваю.

*
* *

Гуляючы жанкі даглядалі за пасевам: палівалі, палолі і старанна акапвалі.

Як на дражджах расло ўсё.

У сялян, па гурочных градах толькі павылазілі з зямлі па два жоўценькіх няўдалых язычкі, капуста пасаджаная схіленымі дубчыкамі стырчала, бы заморанае дзіця. А на каляктыўным гародзе—гуркі гарэць пачыналі, і ўсё гушчэй выпускалі павады, якія спрытна абнімалі адзін другога, сплятаючы граду зялёнымі бархатнымі капялюшыкамі. Капуста лапаватая, зялёная, сэрдачка яе неўзабаве пачало завівацца ў цьвёрды каменчык-качанок. Лён, задраўшы галоўкі, цягнуўся да гары, і хутка яго загоны засьвяціліся мільёнамі сініх вочак.

— Ну і лянок, яшчэ такога ня бачыла наша вёска! Бы паветра на яго іншае,—казалі сяляне, усё часьцей зьбіраючыся вакол каляктыўнага гароду. Любаваліся, як зямля ўвачавідкі плаціла за ўкладзеную ў яе жанкамі працу.

Увосень зямля трэскалася ад пузатых буракоў, турнэпсу і красулі-морквы.

*
* *

Вялізарная плошча, што сьцелецца за садам савгасу,сёньня бурліць жыцьцём. Калышыцца людзкое мора. Гоман, рэмзат коняй, стук калёс, зьліваюцца ў адзіную песьню. Мэлёдыю дапаўняе дробненькі рогат трыера і стракатаньне сячкарні, якая стрыжэ ўкладзеную жменю куля.

Вочы скачуць па багатых радох сельска-гаспадарчай выстаўкі. Хочацца ўбачыць усё адразу.

Коні, з шыямі дугою, блішчаць на сонцы.

Гуртом выходзілі з гароду.

— А кабаны! Глянь, Прося, вунь гэты белы, з куртатым лычам, кабан большы нават за маю карову!

— А жыта, бач, які колас? Зерня, як боб! Ёсьць чым палюбаваща. Во гаспадары, якія ёсьць у нас!

— Чыя-ж гэта капуста такая ўдалая. Няўжо ў нашым краі родзіць такая?

— А ты думала выпісалі аднекуль. Мы і самі з рукамі. Ты памацай, які тугі качан!

— Гэта ўсё парасло ў каляктыўным гародзе, які арганізаваў наш дэлегацкі сход, — казала Агапа, абедзьвюма рукамі ледзь падніма-ючы качан капусты.

А Сідар наўкола качурам пахаджвае.

— Бачыш Агапу, жонку маю,— з гонарам кажа ён,—ня горш людзей. А я, прызнацца, думаў, што з іхняга гароду карысьці кот наплача.

Бліжэй і бліжэй чуваць лапатаньне з вуліцы. Грудзі трактара прачышчаюць дарогу.

Як кніга з стракатымі літарамі, разгарнулася людзкая гурба—прапусьціла трактар, на якім прывязьлі экспанаты з суседняга калгасу.

— Эй, стрымай мудронага каня, дай хоць прыгледзецца да машыны!

А трактар перакруціўся, бы дзяўчына маладая хванабэрачыся сваёй прыгожасьцю, і ўрос у зямлю. Дыхаў газаю трактар, а з яго ў вочы лезуць вялізарнымі літарамі напісаныя словы: „Дзень ураджаю—сьвята ўсіх працоўных. Трактарам і культурай зруйнуем астаткі жабрацтва".

— Так, так. Зараз і я зразумеў... Трактар і агранамічныя веды—вось тая пэўная „каза",якая вывязе да жыта кустом, жыта стогам,—казаў Сідар, ідучы дамоў з сельска-гаспадарчай выстаўкі.

Галка.

ПАДЛІЧЫМ ЛЕТАШНІ ВОПЫТ.

Часу ня траціл!.

Пры Забашэўскай яч. КПБ працавалі 2 дэлегацкіх сходы: у вёсцы--сярод сялянак, і ў савгасе--сярод работніц і жанок рабочых.

Як у адным, так і ў другім сходзе праграма прапрацована была яшчэ к 1 мая.

За час свае працы дэлегацкі сход падрыхтаваў працаздольны актыў, які прымаў удзел ва ўсіх мерапрыемствах партыі на вёсцы. Дэлегаткі рабілі ўплыў на сям'ю ў час распаўсюджваньня пазыкі па ўзмацненьню сельскай гаспадаркі, растлумачвалі дома карысьць гэтай пазыкі. Акрамя таго, дэлегацкі сход закупіў калякты́ўна аблігацыі пазыкі на 15 р.

Адна дэлегатка зьяўляецца сябрам сельсавету. Дэлегаткі савгасу, як больш арганізаваныя, трымаюць цесную сувязь з сялянкамі, наладжваюць вечары, на якія запрашаюць сялянак.

Па ініцыятыве дэлегатак у савгасе ўстаноўлена радыё.

Кепскі бок у працы дэлегацкага сходу гэта тое, што няма праграмы дэлегацкага сходу, прыстасаванай да савгасьніц. Такім чынам, і савгаскаму дэлегацкаму сходу прыходзілася працаваць па праграме, адналькавай з сялянскімі.

Камісія па абгляду.

Барысаўскі раён.

Лучшие в партию и комсомол.

В прошлом составе делегатского собрания фабрики „Красная Березина“ было 96 делегаток. Некоторые из этого количества отсеялись за год из-за декретированных отпусков, по болезни и пр.

Те же делегатки, которые аккуратно посещали собрания, много успели за это время: втянулись в общественную работу, ликвидировали неграмотность. Кроме того, 8 делегаток вступило в партию и 8 в КСМ.

Примером роста делегаток может служить т. Шибалко М. Она работает на ф-ке 15 лет, была отсталой, неграмотной. Сейчас, к выпуску делегаток, она ликвидировала свою неграмотность, систематически пишет в заводскую газету, активно работает в лавкомиссии, производственном совещании, и за всю свою работу т. Шибалко пользуется авторитетом на ф-ке.

Тормозило работу делегатского собрания отсутствие помещения и плохой подбор руководителей. В будущем эти недостатки необходимо изжить.

Соня.

Агульны сход камуны „Зьвязда“.

Я очень хочу быть делегаткой.

Из 54-х работниц, работающих в прачешных, на перевыборное собрание явились 48 человек. До собрания группами собирались—обсуждали кандидатуры.

По докладу о задачах делегатских собраний задавали вопросы, высказывались.

— Делегатское собрание прикрепило меня к Горсовету и лавочной комиссии—говорит делегатка Козлова. Хотя я и не член Горсовета, но, как прикрепленная, аккуратно посещала пленумы его, высказывала свои предложения, которые внимательно выслушивались, и частично проводились в жизнь.

— В работе много мешало то, что не было постоянного помещения и часто менялись руководители делегатского собрания—говорит делегатка Харитонова.

Делегатка Кучмарова сказала:—Я была доизбранной делегаткой, поэтому присутствовала только на 5 последних собраниях, но и за это время меня многому научило делегатское собрание: я начала ликвидировать свою неграмотность и сейчас учусь. Я очень хочу быть делегаткой и в дальнейшем.

После выборов собрание приняло наказ новоизбранным делегаткам.

О. Ф.

Усюды, дзе толькі грамадзкая праца.

Дэлегатка Хадасевіч--бедная сялянка. Яна мае хатку і дзесяціну зямлі.

Матка 4-х сыноў—партыйцаў і камсамольцаў і дачкі - піянэркі, добра памятае свае абавязкі дэлегаткі. Яна шчыра кіруе працай гуртка ручных вырабаў, ня мінае ніводнага агульнага сходу, ні сходаў партыйнай і камсамольскай ячэйкі.

За грамадзкую працу яна карыстаецца сярод насельніцтва вялікай пашанай.

М. Бажок.

Зембін.

ВЫКАРЧУЕМ СЬПЯЧКУ І БЕЗАДКАЗНАСЬЦЬ.

Мы да працы ахвочы, але даць нам працу ня хочуць.

Па ініцыятыве дэлегацкага сходу ў вёсцы Карпілаўка сёлета арганізавалі дзіцячыя ясьлі. Самі дэлегаткі прымалі непасрэдны ўдзел і ў абсталяваньні ясьляў. А вось з прымацованымі да ўстаноў практыканткамі справа кепская. Іх ніколі нават на пасяджэньні ня выклікалі, ніякай працы ім не даручалі.

Яшчэ адзін недахоп у працы нашага дэлегацкага сходу гэта тое, што дэлегаткі не ліквідавалі сваю няпісьменнасьць, а няпісьменных дэлегатак маецца значная колькасьць.

Гарулева Ганна.

в. Карпілаўка.

Руководство по карманам.

У нас делегатское собрание работает без всякого партийного руководства. Еще когда был секретарем ячейки т. Шолок, он иной раз заглядывал на собрания, теперь новый секретарь ячейки т. Курманов, уже 5 месяцев, ни разу не заглядывал на сход, несмотря на то, что каждый раз перед собранием сельженорганизатор его извещает, просит и посылает за ним людей. Тоже и в отношении выделенного руководителя делегатским собранием т. Шейнемана.

Никакие приглашения не помогают, как один, так и другой совершенно не заинтересованы работой, просто не обращают никакого внимания на женработу.

Делегатки и крестьянки даже в лицо не знают ни секретаря ячейки, ни руководителя делегатским собранием.

Все вопросы, касающиеся женработы, приходится вырешать женорганизатору, и вопросы на повестку дня подбираются ею. А если и обратится к руководителю, или секретарю ячейки за советом, то ей отвечают: „ставь что хочешь, делай как сама находишь лучше“.

Теперь подходит кампания перевыборов делегаток, Райкомом уже 2 недели как присланы материалы о перевыборах, между прочим, они целую неделю валялись в столе Курманова, а теперь валяются по карманам Шейнемана. И сельженорганизатор не может допроситься у него материалов.

Я думаю, что все указанные явления ненормальны. Не мешало бы Борисовскому РК КПБ обратить на это внимание, ибо кампания перевыборов делегаток при такой работе провалится.

Р. Выдревич.

Борисовский окр.

Нібы памёр.

Пры Міхалкаўскай ячэйцы КПБ на паперы існуе дэлегацкі сход, і дэлегатак ёсьць багата. Толькі працаваў ён вельмі ўжо даўно. Невядома, па якой прычыне, але за ўсё лета ні разу ня зьбіраўся дэлегацкі сход. Дэлегаткі забылі нават тое, што раней ведалі. А пункт дэлегацкі нібы памёр.

Дзе лекары, якія ўзбудзяць задрамаўшых.

П. Муха.

в. Міхалкі,
Нараўлянскага р-ну.

Созывают, а сами не являются.

Перевыборное собрание назначили на вечер. Крестьянки собираются, а на двери замок висит, темно и никого нет. Ходят вокруг запертого помещения и спрашивают одна другую:

— Была в Нарсуде?

— Была. А ты была в Горсовете?

— Была, но там тоже темно и дверь на замке.

— Пойдем в дом культуры!

Пошли. Там тоже собрание—Нарпит и другие союзы переизбирали делегаток; этих было человек 30, да крестьянок 40, об'единились они, провели перевыборы и разошлись по домам.

А руководители бегают один за другим—ищут крестьянок.

При таком отношении к работе, конечно, толку не будет. Крестьянки, случайно попавшие на союзное собрание, будут спокойно дома сидеть, с уверенностью в том, что они делегаток уже переизбрали. А руководители при бесплановой работе не одну пару сапог истопчут без пользы.

Делегатка.

Быхов.

За что нам отчитываться.

В зимний период наше делегатское собрание работало нормально: прорабатывались как вопросы программы, так и местные, практические. Работал и кружок рукоделия. Делегатки были втянуты в общественную работу.

Но за лето не только не проводилась работа с прикрепленными делегатками, но и вообще делегатских собраний ни одного не было.

Теперь начинаются перевыборы делегаток, и перед нами стоит вопрос: за что мы будем отчитываться перед своими избирателями, разве за ничегонеделание. Нас избрали делегатками, прикрепили к разным организациям, дали наказ—работать. А нам не только никакой работы не поручали, но даже на заседания не вызывали.

Как уехала наша женорганизаторша, ячейка другого человека для работы не выделила и работа заглохла.

Делегатка.

Бегомль.

Дарослых жанчын—у дэлегацкія сходы.

У дэлегацкія сходы часта абіраюць маладзенькіх дзяўчат, якія ня цікавяцца работай дэлегацкіх сходаў, а больш хіляцца да працы ў іншых грамадзкіх арганізацыях.

У мінулым годзе абраныя ў нас дэлегаткамі дзяўчаты нават не хацелі наведваць сходаў, а ня толькі працаваць.

Трэба абіраць у склад дэлегацкіх сходаў больш дарослых жанчын, адсталых, якія адарваны зусім ад грамадзкай працы. У дэлегацкім сходзе яны азнаёмяцца з задачамі ў сацыялістычным будаўніцтве і падрыхтуюць сябе да ўдзелу ў ім.

Дэлегатка **Уфлянд.**

Бабруйская акр.

ТРУД И БЫТ РАБОТНИЦ.

Работніцы на кваліфікаванай працы.

Раней на заводзе „Камінтэрн“ работніцы былі толькі на працы адношчыц і павяртальшчыц. Рабочыя ня верылі, што жанчына можа выконваць іншую, больш складаную працу. Зараз мы бачым, што жанчына робіцца ўсё больш карыснай і незаменнай у вытворчасьці.

На нашым заводзе было ўсяго 28 кваліфікаваных работніц, а цяпер іх—48 чалавек. За гэты тэрмін высунута яшчэ 20 шліфавальшчыц, і не ў далёкім часе жанчыны будуць працаваць на ўсіх шліфавальных варштаках, бо і зараз толькі на 4-х варштаках працуюць мужчыны, а на астатніх—жанчыны.

Зараз мы падрыхтоўваем для вылучэньня на працу дзесятніка работніцу Кацю Сондак; не пазьней 15-га верасьня яна павінна прыступіць да выкананьня сваіх абавязкаў.

Рабкорка.

Завод „Камінтэрн“,
Бабруйскай акр.

Не боимся, а уважаем ценного хозяйственника.

Есть еще какая-то боязнь выдвигать женщину на хозяйственную или административную работу.

У нас, в клеельном цеху, пару месяцев назад, назначили заведующей цехом работницу, клейщицу Рабинович.

Многие перешептывались вначале: „вот уж когда падет дисциплина в клеельном отделении. Ведь женщины они нисколько не будут бояться, а каждый будет делать, что вздумает“.

На деле же вышло совсем другое: мы таки не боимся Рабинович, но аккуратно выполняем все ее требования потому, что видим в ней хорошего хозяйственника, нужного для производства.

Работница.

Речица, ф-ка „Днепр“.



Ученицы-слесаря завода „Энергия“.

Двигают дело квалификации работниц.

Много раз говорили наши работницы о выдвижении их на квалифицированную работу, но разговоры оставались только разговорами, потому, что администрация сопротивлялась.

Нередко выдвигали парней с 2-3-х месячным стажем работы, а работницы с 15-ти летним стажем оставались на прежней работе.

Обсудили этот вопрос работницы на своих делегатских собраниях. Мнение делегатского собрания женорганизатор перенес на обсуждение парт'ячейки фабкома, которые решили выполнить требования делегатского собрания.

Недавно администрация выполнила директиву ячейки и фабкома—2-х работниц перевели для работы в ткацких мастерских.

При наборе брони также поставлена одна работница в слесарно-ремонтной мастерской.

Работница **Ф. Израилева.**

Ф-ка „Дубровенская мануфактура“.

Работы много, а постановка ее не удовлетвояет нас.

Из 36 членов нашего союза только 5 мужчин, остальные—женщины.

Почти все работницы неграмотны. Постановка работы в союзе плохая. Председатель не умеет руководить работой.

Собрания членов союза проходят бестолково и неинтересно для работниц. Часто даже вопросы на собрании разрешаются не верно. Партийное руководство нашим союзом отсутствует.

Э. Жегарева.

Городок, Вит. окр.
Союз Рабземлес.

Рабкорки растут.

Месяцев 8 тому назад работницы очень мало писали в фабричную газету, которая выходила нерегулярно.

Теперь газета аккуратно выходит, большинство стенкорок—работницы. Газета освещает жизнь производства, борется с недостатками.

На фабрике у нас работает рабкоровский кружок, в котором занимаются исключительно работницы.

Теперь мы должны поставить перед собой задачу втянуть в работу стенгазеты новые слои работниц.

Давыдова.

Минск, Щеточная ф-ка.

От редакции.

Работницы-выдвиженки. Пишите об условиях вашей работы.

Пишите о препятствиях к выдвижению работниц на более квалифицированную и руков дящую работу.

Недахопы пад абстрэлам

Проморгали и много.

Работницы фабрики „Спартак“ и завода „Ильич“ окружены невнимательным отношением к их нуждам, грубостью мастеров и хулиганством.

На „Спартаке“ работает больше 200 женщин, большинство из них выполняет черную работу, а на квалифицированной—только единицы. В механическом отделении работает всего одна женщина, а между тем, во время гражданской войны 6 работниц прекрасно справлялись с квалифицированной работой.

С квалификацией работниц на „Спартаке“ очень плохо, однако, ни фабком, ни администрация не считают нужным заниматься этим вопросом.

На „Спартаке“ очень уравновешенные люди. Стоит ли огорчаться тем, что многие девушки уходят со школы фабзавуча, не окончив ее? Уходят из-за невнимательного к ним отношения, из-за окружающего их хулиганства, с тем, чтобы снова очутиться на черной работе.

И это никого не затрагивает.

Да, действительно „уравновешенный“ народ.

Трое девчат успешно окончили фабзавуч, но придирки и хулиганство мужчин вынудили их уйти с квалифицированной на черную работу. Теперь эти квалифицированные сеточницы очутились на низкооплачиваемой работе белильщиц.

Нередко бывают на „Спартаке“ и почище дела: возвратившихся из декретированного отпуска работниц переводят из третьего в первый разряд тарифной сетки.

Не лучше дело с женским трудом и на заводе „Ильич“. Из 75 работниц этого завода на квалифицированной работе только 12. Ни одна девушка не допущена в бронь, а их на заводе 30 чел. За последние годы не было ни одного перевода работниц на высшую квалификацию. Зато нередки случаи, когда работницу снимают с работы для того, чтобы поставить на это место мужчину.

Быт работниц дополняет картину условий их труда. Жестокий жилищный голод заставляет женщин и девушек ютиться в сараях и в одном общежитии с мужчинами. Не приходится удивляться и тому, что некоторые, менее устойчивые работницы, в такой обстановке запивают и скатываются до разврата.

Условия женского труда на „Спартаке“ и „Ильиче“ нетерпимы. Председатель Могилевского окрпрофсовета заявил пишущему эти строки, что для изжития приведенных фактов будут приняты конкретные меры.

Интересно услышать голос партийных и комсомольских ячеек и женорганизаторов „Спартака“ и „Ильича“. Каким образом могло случиться то, что они проспали условия труда работниц.

М. Л.

г. Могилев.

„Болезнь“ Гольца.

— Тов. Гольц, заправьте машину! Тов. Гольц, заправьте станок!

Так обращаются работницы трудколлектива „Красный текстильщик“ к инструктору.

— „Обождешь“. „Успеешь“— отвечает обычно инструктор. Работницы-же работают сдельно, и ждут, а иначе... иначе услышишь также словечки: „базарная баба“, „бандитка“, „помойная яма“ „закрой плевательницу“.

Работницу Р. он довел до истерики, в волю поиздевался и над двумя другими.

И все это проходит безнаказанно. Об'ясняют его поступки— нервной болезнью. „Болезнь“ серьезная. Надо ее „лечить“.

Ф.

г. Борисов.

Защитите батрачку.

Латышев Степан имеет собственную землю, дополнительно он получил в личное пользование десятину усадебной земли из школьного участка. Числился он сторожем Несинской школы, которой заведывала его жена, а работу сторожа выполняла нанятая супругами батрачка Патоцкая

В 1926 г. учительница Латышева уехала на курсы, батрачка же, за время отсутствия хозяйки, забеременела от Латышева.

Видя, что вместо катанья наступает время саночки возить, Латышев уезжает в Нижегородскую губернию, где при помощи „влиятельного“ родственника устраивается в школе учителем с окладом 57 р. 20 к. в месяц.

Обманутая Патоцкая осталась батрачкой у Латышевой, но не на долгое время. Узнав о беременности, Латышева ее выгнала до истечения срока договора, за что только через суд Патоцкой удалось взыскать 42 р.

Вскоре Патоцкая родила ребенка и, не имея средств к воспитанию его, подала на Латышева в суд. Несмотря на изворотливость Латышева и попытки обмануть суд, Латышеву предложено платить на воспитание ребенка 8 р. в месяц.

Первое время кой-как удавалось взыскивать эти деньги, но вскоре Латышев продал сарай, корову, урожай, а в этом году и землю сдал в аренду.

Платить присудили из урожая, а урожая то нет.

Супруги Латышевы оба служат, детей у них нет, живут роскошно, а батрачка Латышева с большими усилиями зарабатывает на кусок хлеба себе и ребенку.

Недавно Латышев передал дело на пересмотр в Минск. Надо, чтобы кто-то помог батрачке Патоцкой отстоять свое право матери, положил конец увиливаниям Латышева.

В.

Несинский с/с., Полоцкого окр.

Будуем каапэрацыю.

Кузьмінская каапэрацыя жанчын ня бачыць.

Што Кузьмінская каапэрацыя аб каапэраваньні жанчын не клапацілася, аб гэтым кажуць факты: з 609 пайшчыкаў каапэрацыі толькі 50 жанчын. Аб льготным каапэраваньні другога сябра сям'і жанчыны нават ня ведаюць.

З 118 упаўнаважаных каапэрацыі тольлі 8 жанчын.

Каапэрацыя нічога не рабіла для таго, каб згуртаваць навакол сябе жаночы актыў, які-б дапамагаў як у каапэраваньні насельніцтва, так і ва ўсёй працы.

Далёка не пасунецца каапэрацыя, калі так будуць і надалей адносіцца да ўцягненьня ў працу сялянак. Трэба будзе больш уважліва адносіцца да сялянак, азнаёміць з каапэрацыйным жыцьцём прымацованых дэлегатак з нова-абранага дэлегацкага сходу, навучыць іх дапамагаць у рабоце.

В. Жураўлёва.

Гарадоцкі р-н.

Работа видна.

В состав нашей лавочной комиссии входит 5 женщин. Между членами комиссии распределены обязанности, каждый знает какую работу он должен выполнить.

Товарищи, прикрепленные к лавке, изучают накладные расходы, ассортимент товаров, дежурят в лавке и следят за правильным распределением недостающих товаров. Один член комиссии прикреплен для постоянной связи с орготделом МЦРК, это способствует более своевременному оповещению пайщиков о получении новых товаров.

Хорошо поставлен у нас учет пайщиков, что было отмечено при обследовании.

Благодаря активной работе членов комиссии пополнение пая у нас прошло с успехом.

Не отстаем мы и в культурной работе: в столовой и на предприятиях используем обеденный перерыв для читки газеты „Потребительское общество", организуем вопросы и ответы. У нас есть кооперативный уголок, закуплена небольшая библиотечка по кооперативным вопросам.

Проделана большая работа по кооперированию рабочих и служащих.

Макрушиц.

Минск, Банно-прачешный отд.

Пай внесем, работу наладим.

Работницы и жены рабочих Торгстроя, после доклада о работе кооперации, открыто высказывались, обо всем подмеченном за время „странствования" по лавкам. Тут и старая, но правдивая и до сих пор, жалоба на невнимательное, подчас грубое, обращение служащих к пайщикам, замечания на недоброкачественность продуктов и многое другое.

В заключительном слове докладчик обещал, что все дельные предложения, которые были высказаны, ЦРК будут приняты во внимание. Хлебные очереди скоро будут изжиты, откроется новая мясная лавка, прибудет мануфактура.

Беда в том, что МЦРК чувствует большой недостаток в средствах при своем обороте. Оборот 250 тыс. руб., а паевых взносов собрано всего 220 тыс. руб. Из 42-х тысяч пайщиков полный пай внесен только 5-ю тысячами пайщиков. Ясно, что при таком положении работу поставить на должную высоту невозможно.

Собрание дало наказ следить за качеством продукции, держать курс на дальнейшее снижение цен. Одновременно обещали, что все работницы, жены рабочих и служащих станут самостоятельными пайщиками кооперации.

Г. Дорский.

Урадзілі буракі.

Крапіва.

Рагуліна прамова да свайго гаспадара.

Я, сялянская карова,
Прашу слова, дайце слова!
Ну, за што цярплю я зьдзек
Праз увесь каровін век?
У хляве—гуляй у жмуркі.
Толькі сьвецяць трохі дзюркі;
Ў ім, папраўдзе вам кажу,
Я ўсю зімачку дрыжу.
Ем-жа я адну салому,
Дык вядома і малому,
Што ня дам шмат малака—
Трэба сена ды мука.
Як саломы я ня выем,
Дык ты перыш мяне кіем.
Па сьпіне ды па баку—
Дзе-ж таму быць малаку?
Калі бегаць зажадаю,
Дык заўсёды вось што маю:
Проста жабу—ня быка—
І прыводжу „пацука".
Дай-жа добрага мне мужа
Ды кармі, каб была дужа.
Прынясу тады прыплод,
Што ня выкінеш за плот.
Ня ўзьбівай мне кіем сьпіну,
А давай лепш канюшыну,
Бі больш рэпай, бураком,
Тады будзеш з малаком;
Па вядру даваць я стану,—
Будзеш есьці сам сьмятану,
Сыры, масла ды тварог,
Астанецца й на налог.

СКОНЧЫЛІ РАБОТУ ЯСЬЛЯЎ.

180 детей прошли оздоровительную школу.

Колония-санаторий, организованный Могилевским Окружкомом Комсомола и детским диспансером, была действительно школой физического оздоровления для ребят.

Правильное хорошее питание, чистота, свежий воздух, дисциплина—вот обстановка, в которой три месяца находились 180 детей рабочих и бедноты Могилева.

Работой колонии руководили 2 врача. В большем почете среди ребят были: физкультура, беседы врача, экскурсии. Поэтому нет ничего удивительного в том, что ребята поправились на 5—7 фун.

Отряд пионеров за это время втянул в свои ряды 20 неорганизованных ребят. Работали кружки. Общественной и пионерской работой руководили 2 воспитателя-комсомольца.

180 ребят запаслись силами для зимней учебы.

Мих. Ланда.

г. Могилев.

Пляцоўка — гняздо камуністычнага выхаваньня дзяцей.

Пляцоўку на заводзе „Камінтэрн" штодзенна наведвалі 35—55 дзяцей. За час працы пляцоўкі дзеці прывучыліся заўсёды мыцца, чысьціць зубы, прывыклі да калектыўнага жыцьця, навучыліся рэвалюцыйным сьпевам і дэкляцыям.

Перашкаджала трохі працы тое, што саюз адмовіўся адпусьціць сродкі на харчаваньне дзяцей, што прымушала іх бегаць у перапынку дамоў за сьнеданьнем.

Рабкорка.

Завод „Камінтэрн".

Кооперация открыла ясли.

Плисские ясли были организованы за счет местной кооперации „Зорки". Крестьянки принимали самое горячее участие в организации ясель: сами сшили всю одежду, белье и все нужное для ясель.

Детей в яслях было 30 человек, из которых 80 проц.—дети пайщиков, остальные—дети бедноты.

Ясли работали 75 дней. За это время все дети поправились, развились умственно. Матери-крестьянки остались очень довольны яслями. Просили кооперацию помочь им в будущем году организовать ясли на собственные средства.

Зьверху—Магілеўская дзіцячая калёнія. Зьнізу—Смалявіцкія яслі.

Вокруг ясель была развернута большая общественная работа: проводились беседы с крестьянками. Теперь 29 матерей подписались на журнал „Беларуская работніца і сялянка".

Я. Волова.

м. Смолевичи.

Шлюць падзяку за пляцоўку.

— Нашы дзеці мінулае лета толькі і ведалі бегаць па вуліцы, лаяцца ды біцца, а зараз на дзіцячай пляцоўцы ім і добра і весела—так кажуць жанчыны Глуска, успамінаючы дзіцячую пляцоўку.

Пляцоўка працавала добра, яе наведвала 35 дзяцей. Прымацованыя да пляцоўкі дэлегаткі цікавіліся працай пляцоўкі.

Дэлегатка.

Брюшной тиф и как от него уберечься.

Всем известна „прилипчивая“ болезнь, которую называют тифом.

„Тиф“—слово не русское, а греческое и обозначает—помрачение сознания, которое обыкновенно бывает у тифозных больных.

Тиф—не одна болезнь, их целых три, совершенно разных заразных болезни: брюшной, сыпной и возвратный.

Я хочу поговорить о брюшном тифе. Делаю это потому, что сейчас у нас в Белоруссии участились случаи заболевания этой болезнью.

Как заражаются брюшным тифом.

Моча, слюна, мокрота, а в особенности кал больного—источники заражения брюшным тифом. Испражнения брюшно-тифозных больных при неосторожности часто попадают на землю, откуда просачиваются или смываются дождем в ближайшие колодцы и реки. Из колодцев и рек, в которые попала зараза, здоровые люди берут воду для питья. Вот вам и дорога, да еще и большая, по которой зараза попадает от больного к таким людям, которые больного даже и не видели.

А вот другой путь распространения заразы: постирают в речке белье, запачканное больным, зараза смылась в речку, а оттуда попадает в желудки тех, кто будет пить воду в сыром виде и, конечно, заболеет.

Часто зараза попадает в колодец через ведро того дома, где есть больной брюшным тифом, и заражает всех жителей, пользующихся колодцем.

Вот почему необходимо иметь одно, прикованное к колодцу ведро (почап), и не разрешать черпать воду своим ведром.

Еще чаще брюшной тиф распространяется через пищевые продукты: сырое молоко, овощи, фрукты, а также другие продукты, которые использовываются без варки (хлеб и другие мучные изделия). Мухи на своих лапках также разносят заразу.

Брюшной тиф начинается постепенно, поэтому, особенно во время эпидемии, необходимо как можно раньше обращаться к врачу. Болезнь эта продолжается шесть недель. Жар держится около 4-х недель. Наивысшего развития болезнь достигает в 3-ю неделю.

Бактерии брюшного тифа поступают в кишки, в их слизистую оболочку, появляется язва. Эти язвы, особенно при неосторожности в пище, вызывают кровотечение, а иногда и прободание кишек, которое, зачастую, оканчивается смертью. При нормальном течении болезни язвы к 4-й неделе подживают.

Брюшно-тифозного больного лучше всего поместить в больницу.

Если это по какой-нибудь причине невозможно, то необходимы следующие меры предосторожности, чтобы зараза не перешла к другим.

Больного нужно поместить в отдельной комнате, если нет ее, то надо выделить отдельный угол. Надо убрать из комнаты все лишнее, особенно с'естные припасы. Выделить для больного отдельную тарелку, миску, чашку и мыть ее отдельно от остальной посуды. Белье больного надо мыть отдельно, прокипятив его сначала в щелоке.

Для надобностей больного надо иметь отдельное ведро или другую посуду. Хорошо перед употреблением ее больным наливать туда раствор негашеной извести или деготь с золой. Сейчас же после испражнений нужно выносить посуду из комнаты больного и выливать подальше от жилья и тех мест, откуда соседи берут для питья воду. Лучше всего выливать испражнения больного в выгребную яму.

Посторонних людей к брюшно-тифозному больному не впускайте,

Ухаживающему за больным нужно часто мыть руки горячей водой с мылом, т. к. зараза с больного легко может пристать к рукам и с рук через пищу попасть в желудок. Поэтому ни в коем случае нельзя приниматься за пищу, не помыв руки.

Доктор **Нейфах.**

Общественницы, делегатки, женский актив, улучшайте состояние колодцев. Ведите борьбу за чистоту своей деревни, оживляйте работу санитарных комиссий и троек, ставьте этот вопрос перед Сельсоветом.

Трыхіноз сьвіней і як ад яго абараніцца.

Што гэта за хвароба.

Трыхінная хвароба ў сьвіней выклікае толькі цяжкае занядужваньне, а ў чалавека гэта хвароба найчасьцей выклікае сьмерць.

Чалавак занядужвае трыхінаю тады, калі зьесьць не агледжанай вэтэрынарным урачом сьвініны ці каўбасы, асабліва сьвежай. Толькі добра прыгатаваная і старая сьвініна, а таксама добра вытрыманая вяндліна—ня шкодны, бо ў ёй трыхіны гінуць.

У чалавека, які зьеў кавалак сьвініны з жывымі трыхінамі, апошнія хутка множацца ў яго кішках і пераходзяць у мяса, учыняючы чалавеку страшэнныя болі, працягам якіх бывае часта сьмерць.

Як распазнаць трыхіноз.

У сьвіней гэта хвароба найчасьцей праходзіць бяз выразных, відавочных адзнакаў. Толькі часамі назіраецца парашкода ў руках, ганячка і часовая страта сілы. Апэтыт у сьвіней не парушаецца і наогул яны хутка перахворваюць.



Трыхіны ў сьвіным мясе.

Каб распазнаць у сьвіным мясе трыхіноз, мяса разглядаюць пад мікраскопам (асобны прыбор, які вельмі павялічвае). Усе сьвіныя тушы, у якіх пры даследваньні знаходзяць трыхіны, абавязкова зьнішчаюць альбо пераганяюць на тлушч для тэхнічных мэтаў.

Як пападаюць трыхіны ў сьвіней.

Да сьвіней трыхіны пераходзяць галоўным чынам ад пацукоў, хворых трыхінозам. Сьвіння ахвотна зьядае гэтых пацукоў і разам заражаецца трыхінамі.

Пацукі таксама пераймаюць трыхіны з сьвінога сала ці мяса, якое яны ласы цягаць з каморы.

Як змагацца з трыхінозам.

Патрэбна абавязкова назіраньне вэтэрынара за месцамі, дзе забіваюць і продаюць сьвініну. Толькі тады, калі кожная забітая сьвіньня будзе агледжана вэтэрынарам, можна быць упэўненым, што трыхіны з мяса не пападуць у страву чалавека.

Неабходна сачыць за тым, каб мяса згінуўшай ад трыхіноза сьвіньні закапвалася глыбока ў зямлю, а ня выкідвалася на задворкі, дзе яго расьцягваюць сабакі і сьвіньні і праз гэта распаўсюджваюць заразу.

Адначасова трэба зьнішчаць пацукоў, якія таксама пераносяць заразу.

Аб трыхінозе трэба памятаць вось што.

1) Ня ўжывайце ў ежу мяса сьвіней, якое не агледжана вэтэрынарам.

2) Не давайце сабакам, катом, асабліва сьвіньням, сьвіных адкідаў.

3) Ня ежце сьвінога мяса ў сырым выглядзе.

4) Здохлых сьвіней закапвайце глыбока ў зямлю.

5) Зьнішчайце пацукоў.

Старонка нашай часопісі і рабселькораў.

Значную частку атрымліваемых намі допісаў рэдакцыя „Беларускай работніцы і сялянкі“ ня мае магчымасьці ня толькі надрукаваць, а нават выкарыстаць.

Чаму гэта так?

Прычына гэтаму тая, што ў допісах гэтых толькі агульныя разважаньні, у іх няма ніводнага прыкладу, няма фактаў.

Як ня трэба пісаць.

„У нашай вёсцы, сялянкі прымаюць актыўны ўдзел у працы ўсіх грамадзкіх арганізацый. Яны абараняюць беднату, змагаюцца з недарэчнасьцямі ў сельсавеце, каапэрацыі і КСУ“.

А з чаго гэта бачно, дзе факты і прыклады, якія-б сьведчылі гэту актыўнасьць і працу? Хто гэтыя сялянкі, з якой вёскі, якія злачынствы яны выкрылі?—аб усім гэты аўтар допісу ні слова ня кажа. А на словы бяз прыкладаў і фактаў аўтару не павераць ні рэдакцыя, ні чытачкі часопісі.

Вось яшчэ адзін прыклад: „Некаторыя працаўнікі Саветаў думаюць, што сялянка ня здольна павесьці працу шырокім размахам, а жанчыны ўжо заваявалі сваёй працай аўтарытэт“.

І тут зноў ніяк невядома, якім чынам аўтар дагадаўся аб думках працаўнікоў Саветаў. У чым гэта выявілася з боку гэтых працаўнікоў? Якою працай сялянкі заваявалі аўтарытэт, што яны зрабілі?

Мы разабралі гэты допіс для таго, каб усе таварышы, прачытаўшы гэта, ведалі аб тым, як ня трэба пісаць.

Усім рабселькорам трэба памятаць, што допісы іх чытаюць работніцы і сялянкі ўсёй Беларусі, праз допісы яны знаёмяцца з тым, як ідзе сацыялістычнае будаўніцтва на фабрыцы і ў вёсцы. Надрукаваны допіс павінен быць цікавым ня толькі для аўтара, але і для ўсіх чытачак, а гэта будзе тады, калі ў допісу будуць не агульныя разважаньні, а жывыя прыклады.

Паштовая скрынка.

Пасланы пісьмы: *Шпакоўскай* (Ворша), *Лешко* (Межынскі р-н), *Багданавай* (Гомель), *Вусавай* (Езярышча), *Ганчар* (Скрыгалаў), *Уфлянд* (Глуск), *Жыгалка, Магілеўскай* (Гарадок), *Жукоўскай* (Плешчаніцкі р-н), *Аляксеевай* (Магілеў), *Паўлоўскай* (Сенно), *Жардоцкай* (в. Янушкавічы), *Трапач* (в. Галі), *Хвошч* (Бабруйск), *Савінай* (Віцебск), *Гайдук* (Бягомль), *Краўцовай* (Міхачэўскі с.-с.), *Мамэдавай, Сокалавай* (Віцебск), *Фінкельштэйн* (Ціхінічы), *Саламонавай* (Віцебск), *Марголінай* (Рэчыца), *Піскун* (Раўнапольле), *Сьвірыдавай* (Гомель), *Шульман* (в. Рудня), *Гарулевай Ганьне* (Рудабелка).

Друкавацца ня будуць: Пазарынь Марылі—„Аб ураджаі“, Я. Ракіта—„Аб перавыбарах Саветаў“, Ткач—„Как работают общественницы“, Саладоўнікавай—„Аб дэлегацкім сходзе“, Ейніт—„Аб падпісцы на пазыку“, Федоровой—„Женщины не отстают“, Мянчыцкай—„Дае прыклад“, Шмюжко—„Перевыборы делегаток“, Кісінай—„Падрыхтоўка да перавыбараў і рэалізацыя пазыкі“, Завугольнік—„Набіваюцца жнеі“, Дорскі—„Перевыборы делегаток“, Липкин Хане—„Аб дэлегатках“, Уфлянд—„Аб займе“.

Перасланы ў іншыя газэты: *Журавлёвай*—(Аб калгасах), *Багун Матрона*—(Аб с.-с.), *Іваненка*—(Лікбез сярод батрацтва)—пераслана ў „Беларускую Вёску“.

Журавлёвай—„Аб перавыбарах дэлегатак“—пераслана ў „Зьвязду“.

Мянчыцкай—„МЮД у вёсцы“, *Піскун М.*—„О займе“—пераслана ў „Чырвоную Зьмену“.

З астатніх паступіўшых допісаў частка пераслана на расьсьледваньне, астатнія будуць выкастаны ў чарговым нумары часопісі.

Допісы *„Работніцы з бальніцы“, Бароўскай* і аб Васільеве—друкавацца ня будуць таму, што няма адрасу аўтара.

Допіс *Мельнік*—ня друкуем, таму, што ён ужо надрукован у „Зьвязьдзе“.

Да нашых падпішчыкаў.

„Беларуская работніца і сялянка“ № 10 выходзіць з спазьненьнем з прычыны рамонту цынкаграфіі (дзе робяць клішэ для малюнкаў).

Наступны 11 нумар выйдзе ў пачатку лістападу.

Усе падпішчыцы з 10 і 11 нумарамі атрымаюць дадаткі.

Выдавец—**Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары* { **С. Крэмер. М. Меерзон.**

Латыгаўская сьмяціна.

„Беларуская работніца і сялянка“ ў падарунак дала мне рэшата—першы гатунак. Загадала адсяваць на ім сьмецьце, дзе-б яго я ня скмеціла.

А мне што, я жонка не ляная: рукавы закасала і сеяць пачынаю.

Хоць ты і ня тутэйшы, прышоў з дарогі, але сядай у рэшата старшыня Латыгаўскага камітэту Ўзаемадапамогі.

Гэта што за паперка?

— А гэта папу сельскай царквы мы выдалі даведку, аб тым, што сын яго бедны з малагодку, і мы просім залічыць яго вучнем у Барысаўскую сямёхгодку.

Во, як бачыце, маем для пачыну на рэшаце, Латыгаўскую сьмяціну.

Адзін другога чакалі і ясьлі праспалі.

Зараз твая чарга, Баклажанскі дэлегацкі сход. Што ты карыснага зрабіў за год? Чаго вы маўчыце дэлегаткі, мо‘ ня сьнедалі?

Мы дэлегацкіх сходаў амаль не наведвалі. Усё спадзяваліся дзяўкі на жанок, а жанкі на дзявок. Нават дзіцячыя ясьлі мы так праспалі, Аксіньня-ж Паўтарыха і Хвеня Варахонская на сход і воч за год не паказалі.

Калі так, сядайце на рэшата, няхай вамі жанкі пацешацца.

Дзе вы дзелі т. Гусеву.

Ну, прышла і твая пара, з Гарадоцкага раёну, камуна—„ЗАРА“. Многа, браткі, у вас высяву. Дзе вы дзелі скарбніка камуны т. Гусеву?

— Мы ёй за паўгода скарбніцтва ня толькі ў рабоце не дапамаглі, а нават спраў зусім не здалі. Шчыра і прызнацца сорам. Мы гэта ўчора такую талковую жанчыну зьмянілі па невядомай прычыне. Быка на індыка прамянялі, але апошняму ўраз справы здалі.

Прыдзецца і вам на рэшаце за розум узяцца, каб не дазволіць курам з вас сьмяцца.

Ганаровая дыпняновая.

Завозна ў нас сёньня! Наступная чарга вёскі Карпілаўкі, што ў Глускім раёне. Што кажа ваша насьценгазэта новая?

— У нас яна толькі адна, ганаровая. Да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка мы яе выпускаем, а пасьля сьпім і новага сьвята чакаем. Да Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады мы-б што-кольвек зрабіць і рады, але дагэтуль і пальцам ніхто не варушыць. Мо‘ хіба рэшата нашу санлівасьць парушыць.

Браткі, сястрычкі! Сёньня канчаю работу. І так дагналі мяне да сёмага поту.

Адпачыю і зноў уздагонку, па сьлядом гарачым за тымі, па кім рэшата плача.

Мукасеева.

Кароста—не хвароба.

— Ну і ладную лазьню пабудавалі. Мыйся на здароўе цяпер, колькі ўлезе.

— Цацка вялікая—лазьня. Мой бацька да сьмерці пражыў бяз лазьні і, акрамя каросты ды паршэй з лішаямі, ніякай хваробы ня ведаў.

У РОЗЬНІЧНАИ ПРАДАЖЫ—20 КАП. ПА ПАДПІСЦЫ—15 КАП.

(*Детская песенка*).

Дворовому дали псу
Овсяной, хороший суп.

Но не ел дворовый пес
Жирный, вареный овес.

И, свернув хвостом вопрос,
У конуры лег Барбос.

А собачьи глаза
Затуманила слеза.

Удивляется петух,
Увивается вокруг.

Шепчет курицам своим:
— Надо с'есть нам суп самим.

Пропадет ведь зря у пса
Суп из чистого овса.

Третий день уж пес лежит
Даже курам не ворчит.

И не кушает, не пьет
Ни жаркое, ни компот.

Из хвоста свернув вопрос
Ничего не ест Барбос.

Где уж будет аппетит,
Коль в груди у пса болит.

Как на горе и на зло
Не дано собаке слов.

Если мог бы пес рыдать.
Если мог бы пес сказать.

День и ночь бы он рыдал,
Всем бы людям рассказал:

Как с хозяином он жил,
Как хозяина любил,

Как хозяйское добро
Караулил от воров.

Как однажды летним днем,
Свой хозяин бросил дом

И уехал навсегда
Одного покинув пса.

Рвется сердце по кускам...
По хозяину тоска...

Разве будет аппетит,
Коль в груди у пса болит.

И к чему ненужный суп
Разобиженному псу.

Удивляется петух,
Увивается вокруг.

Шепчет курам: „Что за чорт,
Суп-то право первый сорт".

Пропадет зря у пса
Суп из чистого овса.

Гр. Ладный.

Зак. № 94. У ліку 6000 экз. Галоўлітбел № 42.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.